Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

22 КАСТРЫЧНІКА 2015 г. ЧАЦВЕР № 204 (28062) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Калі ў нас з'явяцца аўтабаны?

СТАР. 3

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Стыль, пакінуты нам продкамі

Аўтастопам па Афрыцы

ЛІЧБА ДНЯ

558 жыхароў Беларусі

пераадолелі стагадовы рубеж: на 1 кастрычніка ў краіне налічвалася шэсць беларусаў ва ўзросце 110 гадоў і старэйшых, з іх два чалавекі адзначылі свой 115-ы юбілей — жыхаркі Гродзенскай і Мінскай абласцей. Сярод беларускіх доўгажыхароў 488 жанчын і 70 мужчын. Сярод рэгіёнаў краіны лідарам па колькасці доўгажыхароў з'яўляецца Гродзенская вобласць: тут на 1 кастрычніка налічвалася 108 чалавек ва ўзросце, старэйшым за 100 гадоў. У Беларусі адзначаецца тэндэнцыя росту долі пажылых людзей у агульнай колькасці насельніцтва. На пачатак гэтага года ў краіне пражывалі 2,3 млн чалавек старэйшых за працаздольны ўзрост (гэта практычна чацвёртая частка насельніцтва Беларусі), а да 2020 года ўдзельная вага пажылых людзей дасягне 27%.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 22.10.2015 г.

Долар ЗША	17252,00	▼
Еўра	19597,00	▲
Рас. руб.	275,25	▼
Укр. грыўня	761,68	▼

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 15204

Дождж і трошкі цеплыні

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Мінск, 21 кастрычніка.

КОННАЕ ЦАРСТВА

для турыстаў і не толькі

Карэспандэнт «Звязды» пабываў у самым «конным» краі Віцебшчыны і пацікавіўся, ці выгадна займацца прамысловай конегадоўляй.

У Глыбоцкім раёне сёння ў гаспадарках больш за 450 коней. Кіраўніцтва райвыканкама ўпэўнена, што конегадоўля можа быць вельмі прыбытковай справай.

Прапанова аўтару гэтых радкоў азнаёміцца з тым, як на мясакамбінаце жывуць коні, спачатку выклікала шокавую рэакцыю.

— Мы трымаем коней не для таго, каб рабіць з іх мясныя вырабы. Усяго ў нас у двух філіялах прадпрыемства больш за 100 жывёл. На філіяле «Галубічы» ў вёсцы Барок знаходзіцца каля 30 коней. Там займаюцца конным спортам, арганізуюць катанне для ўсіх ахвотных. А калі да нас далучылі стратную гаспадарку, на коней страшна глядзець было: кармілі і даглядалі дрэнна... На працягу пары гадоў сітуацыя змянілася кардынальна. Дырэктар мясакамбіната Анатоль Андрэевіч Дук — вялікі прыхільнік коннага спорту. Вельмі шмат зрабіў для развіцця апошняга, — адзначыў **намеснік дырэктара Глыбоцкага мясакамбіната Сяргей ГРЫНЕВІЧ.**

Калі пад'ехалі да «коннага царства», там былі на экскурсіі падлеткі з Германіі.

Кіраўнік каняфермы Уладзімір БУКАТА.

— У нас спортам займаюцца пастаянна 10 дзяцей і падлеткаў. Удзельнічаюць у спаборніцтвах. Напрыклад, нядрэнна выступілі ў Ратамцы. Нашы вопытныя інструктары праводзяць майстар-класы для ахвотнікаў пакатацца. Кошт даступны: 45 навучальных хвілін падчас коннага паходу ў лес — 120 тысяч рублёў. Можна праехаць вялікі круг на тэрыторыі «манежа». Гэтае задавальненне каштуе значна танней, чым у Віцебску: для дарослых — 20 тысяч рублёў, для дзяцей — усяго 15 тысяч. Для работнікаў мясакамбіната заняткі і адпачынак у сядле — бясплатныя, — распавядае **кіраўнік каняфермы Уладзімір БУКАТА.**

СТАР. 4

■ Добрая справа

«ЗЯЛЁНЫЯ ЛЁГКІЯ» ПАВІННЫ БЫЦЬ ЧЫСТЫМІ

Больш за 20 тысяч добраахвотнікаў прынялі ўдзел у рэспубліканскай акцыі «Чысты лес», якая чарговы раз прайшла ў краіне па ініцыятыве Міністэрства лясной гаспадаркі.

— Сёлета асаблівая ўвага пры правядзенні мерапрыемства надавалася навядзенню парадку на землях ляснога фонду, размешчаных уздоўж аўтамабільных дарог. Добраахвотнікі прыбіралі ад смецця прыдарожныя палосы ўздоўж усіх аўтамабільных дарог рэспубліканскага і абласнога значэння, звярталі асаблівую ўвагу на ачыстку месцаў складзіравання драўніны, адпачынку і іншых аб'ектаў сацыяльнага значэння, размешчаных уздоўж трас, — паведамілі ў прэс-службе міністэрства.

Асноўныя мерапрыемствы акцыі праходзілі з удзелам прадстаўнікоў розных міністэрстваў і ведамстваў у лясных масівах уздоўж участка другой кальцавой аўтадарогі вакол Мінска, якая будуецца. У Рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі па зімовых відах спорту «Раўбічы» ў рамках рэспубліканскай акцыі «Чысты лес» першы віцэ-прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Рэспублікі Беларусь Максім Рыжанкоў, спартсмены-алімпійцы, выканаўца абавязкаў міністра лясной гаспадаркі Міхаіл Амельяновіч, які ўзначальвае камісію НАК «Спорт і навакольнае асяроддзе», а таксама супрацоўнікі апарата НАК заклалі клянова-ліпавую алею.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

ГАЛОЎНАЕ БАГАЦЦЕ І АСНОВА РОСКВІТУ

Наша краіна цалкам падтрымлівае ініцыятывы Сусветнай арганізацыі аховы здароўя і прыкладае максімум намаганняў для іх рэалізацыі

Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, выступаючы ў Мінску на Еўрапейскай міністэрскай канферэнцыі па пытаннях умацавання здароўя на ўсіх этапах жыцця ў кантэксце палітыкі «Здароўе-2020».

Мерапрыемства прысвечана ажыццяўленню Сусветнай арганізацыяй аховы здароўя новай палітыкі «Здароўе-2020». Гэта маштабны план дзеянняў, накіраваны ў тым ліку на папярэджанне і прафілактыку неінфекцыйных захворванняў. На думку Прэзідэнта, эфектыўныя рашэнні, навуковыя даследаванні, якія даюць станоўчыя вынікі па павелічэнні працягласці і, самае галоўнае, якасці жыцця чалавека, вельмі важныя.

«Здароўе нацыі — галоўнае багацце любой дзяржавы і аснова росквіту гэтай дзяржавы», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што са свайго боку Беларусь можа прапанаваць міжнароднай супольнасці вопыт вырашэння шэрагу праблем, такіх, напрыклад, як мінімізацыя наступстваў чарнобыльскай катастрофы, стварэнне моцных медыцынскіх цэнтраў, забеспячэнне максімальнай даступнасці лячэбных устаноў і іншых.

«Аснова нашай унутранай палітыкі — будаўніцтва сацыяльна арыентаванай дзяржавы», — сказаў беларускі лідар, адзначыўшы, што ахова здароўя, адукацыя, даступнае жыллё з'яўляюцца менавіта тымі сферамі, якія ўлічваюць інтарэсы людзей, вызначаюць якасць жыцця і фарміруюць чалавечы капітал. На яго думку, яны з'яўляюцца важным фактарам забеспячэння згоды ў грамадстве і стабільнасці ў любой дзяржаве.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што для гэтага Беларусі прыйшлося многае зрабіць. Прэзідэнт падкрэсліў, што ў перыяд станаўлення суверэнітэту краіны, нягледзячы на эканамічныя цяжкасці, значныя фінансавыя рэсурсы былі накіраваны на рашэнне перш за ўсё сацыяльных задач. Штогод на ахову здароўя выдзяляюцца значныя сродкі. Так, у 2014 годзе іх аб'ём склаў каля 6% ад ВУП. Значныя фінансавыя рэсурсы накіроўваюцца з боку мецэнатаў і спонсараў. Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, усё гэта дало магчымасць у бягучай пяцігодцы ўвесці ў эксплуатацыю больш як 130 аб'ектаў для медыцынскай галіны. Акрамя таго, завершана фарміраванне 17 рэспубліканскіх навукова-практычных цэнтраў, якія ахопліваюць усе галіны медыцыны.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што захаванне і ўмацаванне здароўя грамадзян з'яўляецца стратэгічнай задачай Беларусі.

Кіраўнік дзяржавы са шкадаваннем канстатаваў, што эканамічныя страты, звязаныя з захворваннямі працаздольных грамадзян, інваліднасцю і смяротнасцю, яшчэ вялікія. Ён адзначыў, што пры падтрымцы Еўрапейскага рэгіянальнага бюро СААЗ з улікам перадавога міжнароднага вопыту распрацаваны мерапрыемствы па барацьбе з неінфекцыйнымі захворваннямі. «Мы інвестуем значныя сродкі ў прафілактыку захворванняў, стараемся палепшыць жыллёвыя ўмовы, страхуем работнікаў ад няшчасных выпадкаў», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што ў Беларусі праца па прафілактыцы неінфекцыйных захворванняў вядзецца шляхам укаранення прынцыпаў здаровага ладу жыцця і ліквідацыі фактараў рызыкі. У краіне дасягнуты станоўчыя вынікі ў барацьбе з курэннем, актыўна праводзіцца барацьба з алкагалізмам і ўжываннем наркатычных сродкаў, пры гэтым асаблівая ўвага надаецца маладзёжнаму асяроддзю. Прэзідэнт падкрэсліў, што для Беларусі з'яўляецца відавочным факт прамой залежнасці здароўя нацыі ад узроўню развіцця фізкультуры. Ён адзначыў, што ў краіне рэалізуюць амбіцыйную задачу: фізкультурай павінны рэгулярна займацца 30-40% насельніцтва, а здаровы лад жыцця закліканы стаць візітнай карткай краіны.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што дзяржава не пакідае без увагі і пажылых людзей, ствараючы ўсе ўмовы для іх працяглага, здаровага, актыўнага і творчага жыцця. Прыярытэтам дзяржаўнай палітыкі Беларусі з'яўляецца ахова здароўя маці і дзіцяці.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу і на актыўнае развіццё высокіх тэхналогій у сферы аховы здароўя. У краіне мадэрнізуюцца фармацэўтычныя вытворчасці, асвойваецца выпуск новых лекавых сродкаў.

Сур'ёзная ўвага надаецца таксама паляпшэнню падрыхтоўкі медыцынскіх кадраў. Аляксандр Лукашэнка з задавальненнем заўважыў, што беларуская адукацыя, і не толькі медыцынская, карыстаецца попытам у замежных грамадзян.

«Беларуская ахова здароўя ідзе па шляху мадэрнізацыі і тэхналагічных інавацый. Асноўным прынцыпам з'яўляецца забеспячэнне якасці, эфектыўнасці і бяспекі медыцынскіх паслуг», — сказаў беларускі лідар.

Прэзідэнт падкрэсліў, што поспехаў у ахове здароўя Беларусь не змагла б дасягнуць без дапамогі вядучых краін — Расіі, ЗША, Германіі, Аўстрыі, іншых заходніх дзяржаў, спецыялісты з якіх прыязджалі і вучылі беларускіх калег перадавому вопыту, дапамагалі асвоіць найноўшае абсталяванне. Аляксандр Лукашэнка выказаў падзяку за гэтую дапамогу.

«Хваробы не ведаюць межаў, а значыць, і змагацца з імі мы павінны разам, дапамагаючы адзін аднаму ў пошуку эфектыўных, папераджальных дзеянняў. Разам — заўсёды лягчэй, больш плённа і вынікова», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт лічыць, што вынікоўы дакумент гэтай канферэнцыі — Мінская дэкларацыя — стане важным інструментам у рэалізацыі еўрапейскай палітыкі «Здароўе-2020». «Рашэнне трох яе задач — дзейнічаць раней, дзейнічаць своечасова і дзейнічаць разам — дазволіць дамагчыся станоўчага эфекту па павелічэнні працягласці і паляпшэнні якасці жыцця людзей», — упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

* * *

Сусветная арганізацыя аховы здароўя адзначае значныя дасягненні нашай краіны ў медыцыне. Пра гэта ішла размова на сустрэчы Аляксандра Лукашэнкі з дырэктарам Еўрапейскага рэгіянальнага бюро СААЗ Жужанай Якаб, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы.

Дзякуючы жорстка адбудаванай вертыкальнай сістэме аховы здароўя Беларусі ўдалося дасягнуць пэўных поспехаў. «У тым ліку мы забяспечылі практычна роўны доступ насельніцтва да аб'ектаў аховы здароўя», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў Беларусі, у адрозненне ад некаторых дзяржаў, не бывае такога, што «пад плотам памірае чалавек, калі ў яго няма страхоўкі». «Гэтага ў нас няма, мы заўсёды лечым аднолькава ўсіх людзей», — падкрэсліў ён.

Аляксандр Лукашэнка выказаў зацікаўленасць, каб Жужана Якаб і эксперты СААЗ азнаёміліся з укаранёнымі ў краіне навацыямі. Паказчыкі мацярынскай смяротнасці, нараджальнасці, гібелі дзяцей у дзіцячым узросце знаходзяцца пад кантролем урада. Кожны факт разглядаецца асобна. Сёлета ў Беларусі не зарэгістравана ніводнага выпадку мацярынскай смяротнасці, у 2014-м быў зарэгістраваны адзін, тады жанчыну не ўдалося выратаваць з аб'ектыўных прычын. Раней таксама не было выпадкаў смяротнасці маці пры родах.

Яшчэ адно дасягненне Беларусі заключаецца ў поўнай мадэрнізацыі аховы здароўя. «Мы забяспечылі нашых урачоў самай сучаснай тэхнікай», — адзначыў Прэзідэнт. Асаблівая ўвага надавалася напрамкам кардыялогіі, анкалогіі — самым праблемным з пункту гледжання захворальнасці.

Аляксандр Лукашэнка прызнаў, што такі падыход да аховы здароўя трохі распесціў беларусаў, ён не спрыяе таму, каб чалавек сам клапаціўся пра сваё здароўе. «Усё бясплатна, дзяржава носіць на руках кожнага чалавека», — заўважыў Прэзідэнт. Ён дадаў, што неаднаразова казаў пра неабходнасць кожнаму клапаціцца пра сваё здароўе, паколькі для дзяржавы гэта дорага, да таго ж яна аб'ектыўна не зможа зрабіць усё патрэбнае за чалавека. У гэтай сувязі ў Беларусі стараюцца далучаць грамадзян да здаровага ладу жыцця, прапагандуюць адмову ад шкодных звычак, заахвочваюць заняткі спортам. Акрамя таго, у краіне маштабна разгарнулі барацьбу з ужываннем наркотыкаў.

Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што дырэктар Еўрапейскага рэгіянальнага бюро СААЗ і яе калегі не дарма наведваюць Беларусь, і падзякаваў за ініцыятывы арганізацыі, згадаўшы, у прыватнасці, новую палітыку СААЗ «Ахова здароўя-2020». Аляксандр Лукашэнка даў высокую ацэнку гэтай праграме і запэўніў, што Беларусь з'яўляецца яе прыхільніцай на ўсе 100%.

У сваю чаргу Жужана Якаб падзякавала Прэзідэнту за магчымасць правесці міністэрскую канфэрэнцыю СААЗ у Беларусі і адзначыла высокі ўзровень прадстаўніцтва ўдзельнікаў. Паводле яе слоў, яны хочуць азнаёміцца з вопытам і вынікамі, дасягнутымі Беларуссю ў сферы аховы здароўя.

Дырэктар Еўрапейскага рэгіянальнага бюро СААЗ таксама выказала падзяку асабіста Аляксандру Лукашэнку «за лідарства, намаганні, накіраваныя на ўдасканаленне сістэмы аховы здароўя, якія ўжо далі відавочны вынік». «У СААЗ палітычны складнік мае вялікае значэнне, і мы ўпэўненыя, што Беларусь зрабіла цалкам правільны палітычны выбар, інвеставаўшы ў сферу аховы здароўя», — падкрэсліла Жужана Якаб.

■ Сацыяльны клопат

405 МІЛЬЯРДАЎ РУБЛЁЎ

склала сума адраснай дапамогі, выдадзенай з пачатку гэтага года

Сума дзяржаўных выплат, у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года, вырасла амаль на траціну, адзначае Мінпрацы. На 15 працэнтаў больш стала атрымальнікаў адраснай дапамогі: сёлета іх 189 тысяч чалавек. У асноўным гэта шматдзетныя і няпоўныя сем'і, дзе выхоўваюцца няпоўнагадовыя дзеці. На іх долю прыпадае 74 працэнты ад агульнай колькасці атрымальнікаў сацыяльных грошай. Яшчэ чатыры працэнты — адзінокія пенсіянеры і інваліды.

Сярэдні памер штомесячнай саддапамогі склаў 304 тысячы рублёў, аднаразовай — 856 тысяч. Выплата на пакрыццё выдаткаў на падгузкі — крыху больш за два мільёны. Трэба сказаць, што грошы на памперсы і тэхнічныя сродкі сацыяльнай рэабілітацыі чалавек можа атрымаць незалежна ад яго сярэднедушавога прыбытку. Падставай для гэтых выплат будзе ўрачэбна-кансультацыйнае заключэнне дзяржаўнай установы аховы здароўя або індывідуальная праграма рэабілітацыі інваліда.

Дапамога аказваецца не толькі грашыма. Праблемным сем'ям выдаюць адзенне, абутак, прадметы першай неабходнасці. Забяспечваюць прадуктамі харчавання дзяцей да двух гадоў (сярэдні кошт такога набору раўняецца 744 тысячам). У асобных выпадках дзяржава аплачвае жыллёва-камунальныя паслугі і пагашае запазычанасць па жыроўцы (з пачатку года на гэтыя мэты накіравалі 600 мільёнаў рублёў).

У той жа час прымаюцца захады па прафілактыцы ўтрыманства. Для 1,3 тысячы працаздольных атрымальнікаў выплат камісіі распрацавалі планы па самастойным паляпшэнні матэрыяльнага становішча. 190 чалавекам, якія не выканалі гэтыя планы без уважлівай прычыны, адмовілі ў дапамозе. Павялічваць крытэрыі прадастаўлення дзяржаўнай адраснай сацпадтрымкі пакуль не плануецца.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ. *lubneuskaya@zviazda.by*

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

БАНК ПРЫМЕ ВАЛЮТУ ПАД 6% ГАДАВЫХ

Паводле інфармацыі сайта Нацыянальнага банка Беларусі, Беларусбанк падрыхтаваў да выпуску валютныя аблігацыі для насельніцтва.

Гэтыя каштоўныя паперы будуць прапаноўвацца фізічным асобам у аддзяленнях самага буйнога банка краіны пад 6% гадавых. Намінальны кошт валютных аблігацый складзе 5 тысяч, 3 тысячы і 1 тысяча долараў з тэрмінам абарачэння 18 месяцаў. Тэрмін размяшчэння гэтых аблігацый пачынаецца сёлета з 1 лістапада і працягнецца да 31 кастрычніка 2016 года. Нагадаем, што для набыцця дакументарных валютных аблігацый кліентам не трэба паказваць спецыялістам банка пашпарт, бо гэтыя каштоўныя паперы з'яўляюцца аблігацыямі на прад'яўніка. Акрамя таго, даход, атрыманы па такіх паперах, падаткам не абкладаецца.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

У СОТНІ НАЙЛЕПШЫХ

Брытанскае агенцтва QS Quacquarelli Symonds апублікавала міжнародны рэйтынг QS EECA (Emerging Europe & Central Asia) — ТОП-150 вышэйшых навучальных устаноў еўрапейскіх краін, эканоміка якіх развіваецца, і Цэнтральнай Азіі.

У рэйтынг трапілі дзве беларускія ВНУ — Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт і Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт. Першы размясціўся на 36-м месцы, а другі заняў 72-і радок. Рэйтынг ахапіў 30 краін. У поле зроку трапілі больш як 500 ВНУ. Лідарам стаў Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя М.В. Ламаносава (МДУ). На другой пазіцыі — Новасібірскі дзяржаўны ўніверсітэт. А замыкае тройку Карлаў універсітэт (Чэхія).

Агульны бал ВНУ і яго месца ў рэйтынгу вызначаецца на падставе дзевяці крытэрыяў: акадэмічнай рэпутацыі, рэпутацыі сярод працадаўцаў, суадносін колькасці студэнтаў да колькасці супрацоўнікаў прафесарска-выкладчыцкага складу, долі запрошаных выкладчыкаў з іншых краін, долі замежных студэнтаў, колькасці супрацоўнікаў з вучонай ступенню, эфектыўнасці інтэрнэт-рэсурсу, цытаванасці артыкулаў і колькасці апублікаваных артыкулаў на аднаго супрацоўніка.

Найбольшае прадстаўніцтва ў рэйтынгу маюць расійскія ВНУ — 48 універсітэтаў. Таксама шырока прадстаўлены ВНУ Турцыі (16), Казахстана (14), Польшчы (12) і Украіны (9).

Надзея НІКАЛАЕВА.
nikalaeva@zviazda.by

ПЕШАХОДАМ — АСАБЛІВУЮ ЎВАГУ

Да канца месяца ў сталіцы будзе праходзіць спецыяльнае комплекснае мерапрыемства «Пешаход».

— Падчас яго правядзення асабовы склад дарожна-патрульнай службы асаблівую ўвагу надасць аварыйна-небяспечным пераходам і месцам масавага знаходжання людзей. У навучальных установах і на прадпрыемствах інспектары ДАІ правядуць гутаркі з мэтай спынення і папярэджання парушэнняў правілаў дарожнага руху пешаходамі, — паведамілі ў прэс-службе ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама.

Асноўныя прычыны дарожна-транспартных здарэнняў — парушэнні правілаў пераходу праезнай часткі, а таксама невыкарыстанне пешаходамі ў цёмны час сутак святлоадбівальных элементаў. Пры выкарыстанні флікера адлегласць, з якой кіроўца можа ўбачыць пешахода, павялічваецца з 25-40 метраў да 130-140 метраў.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

УБІРАЛІ ПАД НАГЛЯДАМ

Падчас уборачнай кампаніі на палетках працавалі не толькі аграрыі, але і органы пракуратуры. На Гомельшчыне імі разам з іншымі праваахоўнікамі было праверана 69 сельгаспрадпрыемстваў.

Выяўлены шматлікія факты безгаспадарчасці, неналежнага захоўвання збожжа, іншых матэрыяльных каштоўнасцяў... У прыватнасці, старшы памочнік пракурора Гомельскай вобласці Таццяна Роднева прыводзіць прыклад, калі з даільна-малочнага блока фермы ў Лоеўскім раёне была выкрадзена кампрэсарная ўстаноўка.

У жыхара Хойніцкага раёна выяўлена 120 літраў афарбаванага дызельнага паліва і 40 літраў гідраўлічнай алівы — агульным коштам больш за 1,8 млн рублёў. Устаноўлена, што вадкасці выкрадзены з КСУП імя І. Мележа, дзе грамадзянін працуе механізатарам.

У Лоеўскім раёне згарэў трактар, які належаў КСУП «Бывалкі». Ён не быў забяспечаны вогнетушыцелем. Шкода ад пажару склала Br490 млн.

За лета ў гаспадарках адзінаццаці раёнаў вобласці выяўлена 19 выпадкаў кіравання ведамаснымі транспартнымі сродкамі ў стане алкагольнага ап'янення.

Усяго па выніках праведзеных праверак органамі пракуратуры вобласці да дысцыплінарнай адказнасці прыцягнута 90 асоб.

Ірына АСТАШКЕВІЧ. *iost@zviazda.by*

■ Транспарт

З ВЕТРЫКАМ ПА КРАІНЕ

Усе абласныя цэнтры будуць звязаны са сталіцай сучаснымі шматпалоснымі і хуткаснымі аўтамабільнымі дарогамі

Начальнік упраўлення аўтамабільнага і гарадскога пасажырскага транспарту Мінтранса Сяргей ДУБІНА адзначае, што ў апошнія дзесяцігоддзі міжнародныя грузаперавозкі пастаянна развіваюцца, штогод аб'ём унутрырэспубліканскіх грузавых перавозак складае каля 200 млн тон. Паводле яго слоў, стратэгія інавацыйнага развіцця Мінтранса ўжо вызначыла асноўныя напрамкі дзейнасці аўтатранспарту да 2030 года. Сюды ўключаць як паляпшэнне якасці, даступнасці транспартных паслуг і забеспячэнне транспартнай бяспекі, так і павелічэнне хуткасці дастаўкі грузаў і пасажыраў.

ТРАНЗІТНЫХ МЕЖАЎ СТАНОВІЦЦА ЎСЁ МЕНШ

Сяргей Дубіна паведаміў, што сёлета на 1 кастрычніка ў міжнародных дарожных перавозках краіны задзейнічана больш за 11,2 тысячы грузавых аўтамабільных транспартных сродкаў, 60% з якіх адпавядае сучасным тэхнічным і экалагічным патрабаванням стандартаў Еўра-4 і Еўра-5. Кіраўнік упраўлення таксама адзначыў, што беларускія міжнародныя перавозчыкі займаюць адно з лідзіруючых месцаў на рынку транспартных паслуг дзякуючы свайму прафесіяналізму і сучаснай вытворча-тэхналагічнай базе, што станоўча ўплывае на імідж нашай дзяржавы. У прыватнасці, пашыраецца геаграфія перавозак, у тым ліку ў краіны Азіяцкага рэгіёна. Беларускім бокам заключана 55 пагадненняў у адпаведнай сферы дзейнасці з 44 дзяржавамі. Вялікая ўвага надаецца лібералізацыі ўмоў міжнародных перавозак. З 2014 года цалкам адменена неабходнасць атрымання дазволу на ўсе віды дастаўкі грузаў паміж Швейцарыяй і Беларуссю. У Еўразійскім эканамічным саюзе з гэтага года больш няма неабходнасці атрымліваць дазвол на выкананне двухбаковых, транзітных перавозак, а таксама паміж дзяржавамі — членамі саюза. З 1 студзеня 2016 года пачынаецца першы этап лібералізацыі кабатажных перавозак (выкананне транспартных паслуг, уключаючы пагрузку і выгрузку, замежнымі перавозчыкамі ўнутры дзяржавы) у ЕАЭС.

ВЕСТКІ З ДРУГОЙ КАЛЬЦАВОЙ

Па словах **начальніка аддзела захаванасці аўтамабільных дарог і прыдарожнага сэрвісу Міністэрства транспарту і камунікацый Сяргея ЛЯВОНЧЫКА**, у наступныя два гады на другой Мінскай кальцавой аўтамабільнай дарозе з'явяцца тры сучасныя АЗС. Ён расказаў, што яшчэ на стадыі праектавання міністэрства атрымлівала заяўкі ад некалькіх арганізацый, у тым ліку і ад РУП «Беларуснафта-Мінскаблнафтапрадукт». Гэтыя АЗС, як і ўсе астатнія, у абавязковым парадку павінны змяшчаць пункты харчавання і гандлю, стаянку сама меней для 5 грузавых, 5 легкавых аўтамабіляў і 2 аўтобусаў турыстычнага класа. Дарэчы, першы этап будаўніцтва МКАД-2 павінен быць завершаны да 1 студзеня 2016 года. Да гэтага часу будзе здадзены ўчастак аўтадарогі М3 Мінск — Віцебск да аўтадарогі М6/Е28 Мінск — Гродна — мяжа Польшчы (Брузгі). Другі этап будаўніцтва, як плануецца, будзе доўжыцца да 7 лістапада 2017 г. на ўчастку ад аўтамабільнай дарогі М6/Е28 Мінск — Гродна — мяжа Польшчы (Брузгі) да аўтамабільнай дарогі М1/Е30 Брэст «Казловічы» — Мінск — мяжа Расіі (Рэдзькі). Мяркуецца, што ў перспектыве на МКАД-2 можна будзе развіваць хуткасць да 120 км/г. Сёння дазволеная хуткасць на дарозе складае 90 км/г, але да зімы яе плануецца знізіць да 70 км/ г. Гэта звязана з умовамі надвор'я і тэхналагічнымі асаблівасцямі бетоннага пакрыцця.

ПРЫДАРОЖНЫ СЭРВІС БУДЗЕ КОМПЛЕКСНЫМ

Генеральная схема развіцця прыдарожнага сэрвісу на беларускіх аўтадарогах да 2020 года будзе створана па прынцыпе комплексносці. Мінтранс паспрабуе аб'яднаць сэрвісы кавярняў і заправак у адным месцы, праз кожныя 40-50 км. Так людзі змогуць атрымаць адразу ўсе неабходныя паслугі. Міністэрства сочыць і за тым, каб перспектыўныя аб'екты не траплялі на землі сельгаспрызначэння. Завяршыць распрацоўку новай генсхемы мяркуецца да канца 2015 года. Яна будзе змяшчаць табліцы з існуючымі аб'ектамі, а таксама з тымі, што будуюцца і прапануюцца.

«Заклікаю прадпрымальнікаў і арганізацыі, якія жадаюць узвесці свае аб'екты, звяртацца ў Міністэрства транспарту і камунікацый і рабіць свае прапановы. Мы будзем уключаць іх у праграму, і прадпрымальнікі ў найбліжэйшы час змогуць рэалізаваць свае планы», — адзначыў Сяргей Лявончык. Прапановы будуць прымаць у Мінтрансе да канца 2015 года. Пасля таго як схема будзе зацверджана, прадпрымальнікі змогуць выбраць з сотняў варыянтаў найбольш прымальныя для сябе. Як падкрэсліў спецыяліст, у рабоце па выдзяленні ўчасткаў непасрэдны ўдзел прымаюць аблвыканкамы і райвыканкамы.

ДАРОГІ АСУЧАСНІЦЬ

Сяргей Лявончык паведаміў, што міжнародны тэндар па выбары падрадчыка для абнаўлення ўчастка аўтатрасы М6 Мінск — Гродна з 57-га па 211-ы кіламетр плануецца правесці ў найбліжэйшы час.

«У 2016 годзе плануецца пачаць рэканструкцыю аўтадарогі М6 Мінск — Гродна. Для гэтага мяркуецца прыцягнуць крэдыт Сусветнага банка», — сказаў начальнік аддзела.

Кажучы пра абнаўленне аўтатрас, што злучаюць Мінск з абласнымі цэнтрамі, Сяргей Лявончык праінфармаваў, што ў наступныя гады плануецца мадэрнізаваць аўтадарогу М8 на ўчастку ад Оршы да Віцебска. Работа на ўчастку Бабруйск — Жлобін плануецца завяршыць у сярэдзіне 2016 года. Такім чынам, аўтадарога М5 будзе адпавядаць параметрам I катэгорыі на ўсім працягу.

Па меры завяршэння прызначаных на найбліжэйшыя гады аднаўленчых работ усе абласныя цэнтры будуць звязаны са сталіцай сучаснымі шматпалоснымі і хуткаснымі аўтамабільнымі дарогамі.

Сяргей Лявончык упэўнены, што «гэты факт станоўча адаб'ецца на эканоміцы аўтатранспартных перавозак і стане дадатковым стымулам для павышэння эфектыўнасці працы ўсёй народнай гаспадаркі краіны».

Ілья КРЫЖЭВІЧ.
kryzhevich@zviazda.by

■ Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА

КЛАС ПЕРАМАГАЕ

У трэцім матчы групавой стадыі Лігі чэмпіёнаў БАТЭ на хатнім стадыёне саступіў славутай «Барселоне»

Верыць у тое, што нашы клубы могуць адбіраць балы ў футбольных грандаў, трэба, але далёка не заўжды ўсё складваецца так, як нам хочацца. Тым больш у матчы з такой неверагоднай камандай, як «Барселона».

У матчы з БАТЭ, які адбываўся пры запоўненых трыбунах, каталонцы з першых хвілін пайшлі ў атаку. Праўда, у першым тайме «гранатавым» гэта плёну не прынесла. У многіх момантах гасцям не хапала дакладнасці, а вось у другой палове іх прыцэл не падвёў. Што цікава, абодва мячы забіў Іван Ракіціч, футбаліст, які выйшаў на замену. З лаўкі запасных ён быў падняты нечакана — сітуацыя вымушала (траўма партнёра), але ў гульню ён увайшоў выдатна. Спачатку

Фота Надзеі БУЖАН.

біў галавой — пайшло вышэй варот, а ў другой палове ў сваіх спробах быў пераканаўчым. Хлопцы Аляксандра Ермаковіча, безумоўна, стараліся гуляць у атаку. Аднак не ўсё, што ты запланаваў, можа ажыццявіцца ў сустрэчы з такім сапернікам. Будзем верыць усё збудзецца. Калі не ў гэтым матчы, дык у наступным.

— Чакалі большага ад першага тайма, — сказаў пасля гульні Аляксандр Ермаковіч, галоўны трэнер БАТЭ. — Не атрымаўся выхад у контратаку. Ды і на працягу гульні ён не атрымліваўся. Галоўнае расчараванне. Нам далі ўрок футбола: як трэба атакаваць, як дзейнічаць пры страце мяча. Узровень саперніка адчуваецца ва ўсім. Трэба вучыцца і вучыцца.

У другім матчы нашай падгрупы італьянская «Рома» ўнічыю згуляла з «Баерам» — 4:4. БАТЭ пакуль знаходзіцца на трэцяй прыступцы турнірнай табліцы.

Тарас ШЧЫРЫ.
taras@zviazda.by

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

ПАДМАН ПА «ПРЭЙСКУРАНЦЕ»

У сталіцы мужчына, спасылаючыся на сувязі ў розных арганізацыях, прапаноўваў усім ахвотным свае паслугі пасярэдніка ў арганізацыі за пэўную суму атрымання вадзіцельскага пасведчання без здачы прадугледжаных заканадаўствам экзаменаў.

— У «прэйскурант» махляра ўваходзіла наступнае: афармленне вадзіцельскага пасведчання катэгорыі «А» і «В» без здачы адпаведных залікаў і экзаменаў; датэрміновае вяртанне вадзіцельскага пасведчання і талона да яго асобам, пазбаўленым права кіравання транспартным сродкам, да заканчэння тэрміну пазбаўлення; афармленне фіктыўных пасведчанняў аб заканчэнні навучання ў аўташколе, — паведаміла прэс-афіцэр Савецкага РУУС г. Мінска Аляксандра Папова. — Супрацоўнікі крымінальнага вышуку высветлілі, што з ліпеня па верасень да зламысніка звярнуліся 10 «кліентаў», аднак ніводзін з іх так і не атрымаў жаданага, паколькі ажыццявіць тое ў мужчыны папросту не было аніякай магчымасці. Яму верылі на слова. Нягледзячы на гэта, ён завалодаў грашовымі сродкамі ў суме каля 85 мільёнаў рублёў. Махляру пагражае да чатырох гадоў пазбаўлення волі.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

ДЫЕТЫЧНАЕ МЯСА — ДЛЯ СЯБЕ І НА ЭКСПАРТ

У Лідскім раёне ажыццяўляецца маштабны беларуска-літоўскі інвестыцыйны праект па прамысловай вытворчасці прадукцыі з мяса індычкі.

Інвестар, літоўская кампанія ARVI, якая ўжо мае вопыт арганізацыі такіх комплексаў у Еўропе, атрымала зацікаўленую, дзейсную падтрымку з боку беларускіх партнёраў. Непадалёк ад вёскі Ганчары цяпер узводзяцца фермы, дзе будуць гадавацца індычкі. Ужо амаль гатовы цэх па глыбокай перапрацоўцы мяса. Акрамя таго, пабудуюць завод па вытворчасці кармоў. Такім чынам, на Лідчыне будзе ажыццяўляцца ўвесь цыкл па вытворчасці прадукцыі з мяса індычкі — спажыўцу прапануюць яго ў сырым, вараным, вэнджаным і іншых відах. Гадавая вытворчасць комплексу складзе каля пяці тысяч тон гатовай прадукцыі. У асноўным яна будзе разлічана на беларускі рынак, а каля 30% накіруюць на экспарт у краіны Мытнага саюза.

Дырэктар замежнага таварыства з абмежаванай адказнасцю «АРВІБЕЛАГРА» Арунас БЕРНАДЗІШУС кажа, што інвестыцыйны дагавор выконваецца згодна з вызначанымі тэрмінамі, першую прадукцыю павінны атрымаць да сярэдзіны наступнага года. Дзякуючы гэтаму інвестыцыйнаму праекту створаць больш за 200 рабочых месцаў.

Барыс ПРАКОПЧЫК.
prakopchik@zviazda.by

ЗА ПЕТЛІ — БОЛЬШ ЗА 431 МЛН

Да 3,5 года пазбаўлення волі з выплатай штрафу і многамільённай шкоды прысудзілі браканьера, які паляваў на тэрыторыі нацыянальнага парку «Прыпяцкі».

Парушальнік лавіў дзічыну пры дапамозе металічных петляў, устанаўліваючы іх на ствалах дрэў. Даказана некалькі фактаў незаконнага паляванне, у выніку якіх былі здабыты тры дзікі, чатыры алені і казуля.

Нанесеная прыродзе шкода ацэнена ў 345,6 мільёна рублёў. Апроч пакрыцця гэтай сумы, браканьера абавязалі выплаціць яшчэ 67,5 мільёна нацпарку, а таксама прызначылі штраф — 18 мільёнаў рублёў. Цягам пяці гадоў мужчына не зможа займацца дзейнасцю, звязанай з паляваннем.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

■ Працяг тэмы

КАРАБЕЛЬ ВІКІНГАЎ ПОЙДЗЕ ПА МУХАЎЦЫ

У аграсядзібе пад Кобрынам пабудаваны дракар, які з'яўляецца імітацыяй сярэднявечнага плаўсродку

Летась «Звязда» расказвала, што гаспадары сядзібы «На Зарэчнай вуліцы» Ала і Сяргей Палікарпукі ўзводзяць судна для падарожжаў турыстаў (нумар за 1 кастрычніка 2014 года. — Аўт.). І вось карэспандэнт газеты зноў пабывала ў вядомай на Брэстчыне аграсядзібе. Сяргей расказаў, што пры рэгістрацыі плаўсродку ўзніклі пэўныя цяжкасці, — найперш праз тое, што пакуль карабель будавалі, змянілася заканадаўства. Але яны, тыя цяжкасці, пераадольныя. Усе заўвагі, якія зрабілі спецыялісты, гаспадары ўлічылі. І ў наступным красавіку-маі, з пачаткам навігацыі, «Слейпнір» пойдзе па водах Мухаўца.

Сяргей ПАЛІКАРПУК на дракары...

Менавіта так, на скандынаўскі манер назвалі дракар. У перакладзе гэтае слова блізкае па значэнні да «хуткі». А задумалі Палікарпукі пабудаваць такую незвычайную рэч пасля таго, як даведаліся, што менавіта ў гэтых мясцінах пралягаў адзін з пяці шляхоў «з варагаў у грэкі». І, пачынаючы з IX стагоддзя, такія судны хадзілі па рацэ, вазілі бурштын з Балтыі. Са сродкамі на ўвасабленне ідэі-мары, якой Ала і Сяргей загарэліся даўно, дапамог адзін з праектаў міжнароднай тэхнічнай дапамогі, які рэалізуецца ПРААН.

Корпус карабля ўзводзіў у асноўным Сяргей сваімі рукамі. У розных выпадках звяртаўся да народных майстроў, рамеснікаў, удзельнікаў кобрынскага рэканструктарскага клуба «Перунова кола» і брэсцкага «Жалезны жолуд». Яны выраблялі асобныя дэталі. Гаспадары падкрэслілі, што іх «Слейпнір» з'яўляецца менавіта імітацыяй, а не копіяй карабля вікінгаў. Бо ў той час не было сучасных матэрыялаў. Цяпер жа каркас зроблены з пластыку, а звонку абшыты дрэвам. Дракар упрыгожаны здымнай галавой дракона, стылізаваны пад даўніну шчытамі, мае чатыры пары вёсел. Праўда, грозная галава з іклами зараз знятая, бо карабель разбіраюць на зіму. Вікінгі ж, як сведчаць летапісы, мацавалі падобныя элементы, каб пужаць праціўнікаў. А дома нярэдка здымалі іх.

Гаспадыня сядзібы Ала расказала, што ўжо распрацаваны маршрут воднага падарожжа. Ён пройдзе па тэрыторыі Кобрынскага і Жабінкаўскага раёнаў. Адпачывальнікам прапануюць не толькі любавацца прыгожымі краявідамі, праплываючы па рацэ, але і прайсціся да славутасцяў пешшу, праехаць на веласіпедах, праплыць на драўляным плыце-катамаране. Госці змогуць наведаць, напрыклад, царкву ў Здзітаве, якая з'яўляецца помнікам драўлянага дойлідства XVI стагоддзя і прэтэндуе на ўключэнне ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Турысты таксама пабываюць на Купчыцкім полі, дзе адбылася бітва паміж паўстанцамі Тадэвуша Касцюшкі з войскамі Аляксандра Суворава. Ахвотныя пасажыры дракара змогуць заказаць у канцы прагулку на конях. Праграма яшчэ будзе дапрацоўвацца і ўдакладняцца: вядома, у бок пашырэння.

На «Слейпніры» прадугледжаны экскурсавод. А веслярамі могуць выступаць па жаданні і самі турысты. Тэставы спуск карабля на ваду і заплыў па рацэ Мухавец прайшлі паспяхова. Фактычна ўсё гатова для дзяржаўнай рэгістрацыі судна. Каб пакатацца на ім, ужо ёсць заяўкі з Мінска, іншых гарадоў і еўрапейскіх краін.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
yackevich@zviazda.by

Кобрынскі раён

Фота Валерыя КАРАЛЯ.

...і дэманструе галаву дракона.

■ Май на ўвазе!

СТАЛІЦА ЗНОЎ МЯНЯЕ АБЛІЧЧА

Праходзіць грамадскае абмеркаванне новага генплана Мінска



Аб гэтым паведамляе Мінскі гарвыканкам. Рэалізаваць праект «Генеральны план Мінска (карэкціроўка)» плануецца як на тэрыторыі горада, так і на частцы тэрыторыі Мінскага і Смалявіцкага раёнаў.

Так, архітэктары прапануюць спыніць актыўную забудову сталіцы, чацвёртая лінія метро стане кальцавой, а трамваі пусцяць у мікрараён Сухарава і Лагойск.

Каб удасканаліць сістэму рассялення жыхароў краіны, неабходна развіваць гарады-спадарожнікі, апроч таго, патрэбна засвоіць гарадскія землі, якія раней выкарыстоўваліся неэфектыўна, аптымізаваць жыллёвую палітыку са зніжэннем аб'ёмаў жыллёвага будаўніцтва і захаваннем тэрыторый для сельскай гаспадаркі. Дзеля таго актуалізуецца дзейны генеральны план.

Гэты дакумент аб'ядноўвае горадабудаўнічую дзейнасць гараджан, інвестараў, забудоўшчыкаў, органаў дзяржаўнага кіравання горада і краіны, каб дасягнуць комплекснага, збалансаванага і ўстойлівага развіцця беларускай сталіцы. Калі вам неабыякавы лёс нашага горада і якасць жыцця ў ім нашчадкаў, выказвайце свае думкі наконт яго далейшай трансфармацыі. Грамадскае абмеркаванне пачалося 12 кастрычніка і будзе доўжыцца да 5 лістапада 2015 года.

Азнаёміцца з экспазіцыяй і іншымі матэрыяламі генеральнага плана Мінска можна ў гэты ж перыяд (з панядзелка па пятніцу — з 14-00 да 18-00, у суботу і нядзелю — з 10-00 да 15-00) у будынку УП «Мінскград» па адрасе: вул. Камсамольская, 8, 2 паверх, каб. 204.

Заўвагі і прапановы прымаюцца ў перыяд правядзення грамадскага абмеркавання пісьмова ў кнізе заўваг і прапаноў з 14-00 да 18-00 па адрасе: вул. Камсамольская, 8, 2-гі паверх, каб. 204, а таксама праз паштовую сувязь, электронную пошту (e-mail: kaig@minsk.gov.by). Іх разгледзяць на архітэктурна-горадабудаўнічым савеце пры галоўным архітэктары Мінска.

Уся інфармацыя аб выніках грамадскага абмеркавання будзе даступная на сайце Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта www.minsk.gov.by.

Дзіяна СЕРАДЗЮК.
seradzyuk@zviazda.by

КОННАЕ ЦАРСТВА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

На ферме займаюцца і іпатэрапіяй. Грошы з цяжка хворых не бяруць. Ёсць дасягненне: палепшыўся стан здароўя дзяўчынкі з Віцебска. Нават вопытныя ўрачы з абласнога цэнтра прыемна здзіўляліся. Пра звычайны цуд здымалі тэлевізійны сюжэт...

— Конны спорт насамрэч вельмі карысны для здароўя. Ён дэмакратычны для пачаткоўцаў. Не важна, якія ў цябе рост, мускулы. Галоўнае — каб любіў жывёл, каб хацеў навучыцца разумець іх. І даволі хутка можна навучыцца ўпэўнена адчуваць сябе ў сядле. А браць удзел у спаборніцтвах можна і ў сталым узросце, — сказала **Кацярына ПАЗНЯК, памочніца трэнера.**

Пагутарыў з юнымі спартсменкамі.

Валерыя Грыневіч і Эвія Казура вучацца ў 10 класе. Жывуць у Глыбокім. Валерыя ўжо мае 1-ы спартыўны разрад і званне чэмпіёнкі Беларусі ў сваёй узроставай катэгорыі. Яе аднакласніца таксама спрактыкаваная наезніца: выступала на спаборніцтвах у Магілёве, Мінску, Гродзенскай і Віцебскай абласцях.

На філіяле «Галубічы» адзначылі, што з кожным годам усё больш прыезджых, якія хочуць правесці вольны час на конях. Значыць, можна будзе зарабляць яшчэ больш. Ёсць і карэта, якую арандуюць на вяселлі. А якім незабыўным будзе прызнанне ў каханні ў салоне транспарту мінулага!

На ААТ «Залатая падкова», дзе ў ліку іншага займаюцца рэалізацыяй жывёл элітных парод, даход ад конегадоўлі склаў каля 100 мільёнаў рублёў. Кіраўнік гаспадаркі Аляксандр Стукан мае добрае бачанне

Выступленні спартсменаў з Глыбоцкага раёна на спаборніцтвах.

перспектыў традыцыйнага беларускага віду жывёлагадоўлі...

Спатрэбяцца коні, спецыялісты і для арганізацыі коннага адпачынку ў санаторна-аздараўленчым комплексе, які будуецца на беразе возера Пліса. Пра гэта сказаў кіраўнік беларускай фірмы-інвестара. Пяць гадоў таму на месцы былой ваеннай часці пачаліся работы па расчыстцы тэрыторыі. Сёлета запланавана здаць пад ключ санаторый, у якім адначасова змогуць паправіць здароўе каля 350 чалавек. Іх трэба і забаўляць. Дык як жа абысціся без коней?

Вопыт конегадоўцаў Глыбоцкага раёна нядаўна вывучалі латышы. Сёлета ў рамках праграмы Еўрарэгіёна «Азёрны край» там пабывалі прадстаўнікі краявых адміністрацый Латвіі. Сярод гасцей была іпатэрапеўт. У планах — арганізацыя сумесных «конных праектаў»...

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
pukshanski@zviazda.by

Глыбоцкі раён — Віцебск.

Фота аўтара і з архіва прадпрыемства.

Карэта каняфермы, якую можна арандаваць.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

22 КАСТРЫЧНІКА 2015 г.
ЧАЦВЕР
№ 21 (15780)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

Аляксей ХЛЯСТОЎ:

«У мяне верылі — і ўсё атрымалася»

Ён першым прадстаўляў Беларусь на міжнародным конкурсе «Новая хваля». Свой сцэнічны вопыт набываў, супрацоўнічаючы з ансамблем «Сябры» і выступаючы для публікі ў Бахрэйне. А сапраўдную папулярнасць гэты выканаўца адчуў пасля выхаду альбома «Адкажы мне, чаму», які стаў лідарам продажаў у 2004 годзе. Хлопец успрыняў той поспех як знак, што і ў сваёй краіне можна быць запатрабаваным, паспяховым і любімым публікай. І, здаецца, нават праз два дзясяткі гадоў на эстрадзе спявак Аляксей Хлястоў не страціў свайго імпэту. Мы распыталі яго пра працу з Дзянісам Майданавым, урокі мінулага і сямейныя кампрамісы.

— Нядаўна на вялікім экране быў прадстаўлены фільм «Мы, браты». Як вы трапілі ў каманду тых, хто мае дачыненне да яго стварэння?

— Далучыўся да яе з падачы прадзюсара фільма Сяргея Ждановіча, які папрасіў мяне праспяваць песню. Спачатку размова вялася толькі пра дэмазапіс, я нават не ведаў нічога пра саўндтрэк. А недзе праз месяц, калі карціна ўжо была часткова змантыравана і я паглядзеў урыўкі, то быў уражаны. Ва ўсім свеце, каб абудзіць інтарэс да кіно, да яго пішуць музыку і здымаюць кліп з фрагментамі фільма. Незвычайнае пачуццё, калі разумееш, што ўдзельнічаеш у камандной працы і маеш дачыненне да стварэння нацыянальнага праекту. Ды і з пазіцыі набыцця вопыту мне таксама было цікава папрацаваць. Мы знялі кліп, і ён — яшчэ адна магчымасць, каб людзі пачулі цябе не толькі ў Беларусі, але і ў многіх замежных краінах. Фільм прадалі ў 40 краін свету і, як бы яго ні крытыкавалі, — вынік ёсць.

— Праца ў дуэце — для вас не першы вопыт. Тандэм з Дзянісам Майданавым адрозніваецца ад папярэдніх?

— Увогуле мне камфортней спяваць сольна, бо тады можаш пражываць кампазіцыю, арыентуючыся на свае эмоцыі. А ў дуэце важна адчуваць настрой партнёра, імкнуцца шукаць правільныя вакальныя інтанацыі, каб усё гучала гарманічна. Калі канкрэтна гаварыць пра песню «Ты — брат», то гэта гісторыя двух славянскіх братоў, якія распавядаюць пра свае душэўныя перажыванні, пра ўзаемапаразуменне і ўменне дараваць... Я, у прынцыпе, чалавек адкрыты, і мне нескладана быць у камандзе. Сёння я працую з цудоўнымі людзьмі, якія сваёй прысутнасцю даюць мне разуменне таго, што мы адна сям'я. І з імі я магу раздзяліць тую радасць, якую адчуваю, знаходзячыся на сцэне.

(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)

Сваім розумам

МЕРКАВАННЕ З АДНОЙ КРЫНІЦЫ — ЯШЧЭ НЕ ІСЦІНА,

або Чаму не ўся інфармацыя ў інтэрнэце раўназначная?



Іржы Трунда: «Мы не шукалі правільны пункт гледжання».

Паліць насоўку чарнілами, затым яшчэ дадаткова яе запэцкаць, пакласці ў нагрудную кішэню кашулі, завязаць тую на некалькі вузлоў, змясціць у пральную машыну, запусціць праграму і... чакаць цуду. Калі верыць рэкламе, то пры выкарыстанні новага цудадзейнага пральнага парашку нават пры тэмпературы ўсяго ў 40 градусаў пасля заканчэння мыцця насоўка вярне свой першапачатковы выгляд.

— Мы зрабілі тое ж самае ў школе, выкарыстаўшы стандартную пральную машыну, у якой мыюць спартыўную форму. Зразумела, што ніводная наша спроба не завяршылася такім поспехам, як у рэкламе: насоўка ўсё роўна заставалася запэцканай. Дзякуючы гэтаму вельмі простаму і нагляднаму эксперыменту (а вучні ўвесь працэс канспектавалі як дослед) для некаторых з нашых выхаванцаў стаў адкрыццём факт: зусім неабавязкова тое, што абсалютна сур'ёзна і «кампетэнтна» дэманструецца па тэлебачанні, павінна быць праўдай, — расказвае **дырэктар базавай школы «Вратыслаўска» горада Прагі Іржы ТРУНДА.** — Усе мы ведаем, што дзеці і падлеткі могуць даслоўна цытаваць дзясяткі рэклам, і яны не заўсёды крытычна ўспрымаюць пачутае.

Нядаўна група чэшскіх педагогаў па запрашэнні Нацыянальнага інстытута адукацыі наведала нашу краіну і правяла шэраг навукова-практычных семінараў ва ўстановах адукацыі Жодзіна, Гродна, Століна і Мінска, каб падзяліцца з беларускімі калегамі сваім досведам у медыяадукацыі.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

Пазнаёміцца з прафесіяй

НА АХОВЕ ПРАВАПАРАДКУ — «СТРАЛА»!

Супрацоўнікаў спецпадраздзялення дарожна-патрульнай службы «Страла» Міністэрства ўнутраных спраў мы звычайна бачым тады, калі яны суправаджаюць высокіх службовых асоб дзяржавы і эскартуюць кіраўнікоў замежных дэлегацый. Бліскучыя матацыклы і аўтамабілі едуць роўна, ім заўсёды саступаюць дарогу астатнія. Але ў «Стралы» ёсць і іншыя важныя функцыі: яна кантралюе работу падраздзяленняў ДАІ, аказвае дапамогу ў забеспячэнні бяспекі дарожнага руху ў рэгіёнах. На гэты раз супрацоўнікі спецпадраздзялення разам з журналістамі адправіліся на ўскраіну Мінска выяўляць правапарушальнікаў на дарогах.

Перад выездам мы паразмаўлялі з **намеснікам начальніка спецпадраздзялення ДПС «Страла» МУС Беларусі па ідэалагічнай працы і кадравым забяспечэнні Анатолем КУКАРЦАВЫМ.** Ён у спецпадраздзяленні ўжо 8 гадоў і ведае пра службу ўсё:

— Сёння «Страла» — гэта пяць службаў, у якіх працуе больш як 70 супрацоўнікаў. Праца вельмі складаная і адказная, таму, каб стаць часткай нашага калектыву, неабходна мець вышэйшую адукацыю і значны вопыт работы: як мінімум пяць гадоў у ДАІ ці дзесяць — у іншых падраздзяленнях міліцыі. Акрамя гэтага, кандыдаты павінны знаходзіцца ў выдатнай фізічнай форме і прайсці шматлікія псіхалагічныя тэсты на эмацыянальную ўстойлівасць.

Фота Аліны КОБЕЦ.

«Вашы правы, калі ласка!»

Анатоль Кукарцаў правёў для нас невялікую экскурсію па службовых памяшканнях спецпадраздзялення. Увагу адразу прыцягнула незвычайная сцяна ў кабінеце службы эскартавання — тут у рамках вісяць выявы сцягоў і гербаў краін, імёны кіраўнікоў, якіх суправаджала «Страла». Побач у калідоры размешчаны стэнд са шматлікімі ўзнагародамі, якія прывезлі супрацоўнікі падраздзялення з міжнародных і рэспубліканскіх спартыўных спаборніцтваў, конкурсаў прафесійнага майстэрства.

...І вось мы накіроўваемся на выезд са сталіцы разам са **старшымі інспектарамі ДПС службы эскартавання «Стралы» маёрам Станіславам КАЗАЕВЫМ і капітанам Аляксеем ГАЎРЫЛЕНКАМ.** Пакуль едзем па Мінску, я распытваю старшых інспектараў пра іх працу.

— Ехаць на матацыкле ў эскорце падчас суправаджэння высокіх службовых асоб хоць і надзвычай адказна, але вельмі прыемна. Толькі гэта бывае далёка не кожны дзень, — распавядае маёр Казаеў. — Куды часцей мы працуем, як і іншыя супрацоўнікі ДАІ, на дарозе, сочым за выкананнем кіроўцамі правілаў дарожнага руху. А спыняць на дарогах нецвярозых аўтамабілістаў — вось тут прыемнага мала, бо ніхто не хоча плаціць штраф у 18 мільёнаў і пазбаўляцца пасведчання кіроўцы на тры гады.

(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
22 10 2015 г.

Незвычайны ракурс

ПАКАЗВАЕ... ШКОЛЬНАЕ TV

Нават маленькая правінцыяльная школа можа быць паспяховай

Прывіць любоў да малой радзімы праз стварэнне школьнага дакументальнага клуба вырашылі ў невялічкай базавай школе чэшскага гарадка Пабяжовіцэ. Пра тое, каму прыйшла гэта ідэя і як звычайныя школьнікі з правінцыйнага гарадка, размешчанага на мяжы з Германіяй, сталі рэпарцёрамі Чэшскага тэлебачання, расказаў дырэктар школы Уладзімір ФОЙСТ.

— Наш рэгіён называецца Чэшскі лес. Яшчэ яго называюць «зялёным дахам Еўропы». Гэта цудоўная прыродная рэзервацыя захавалася дзякуючы «жалезнай заслоне». Карэнных жыхароў адсюль выселілі, але ў 90-я гады, калі «заслоны» не стала, тэрыторыя зноў пачала засяляцца. Адна з самых галоўных праблем на сённяшні дзень — высокая міграцыя насельніцтва па сацыяльна-эканамічных прычынах. Моладзь, на жаль, не затрымліваецца і з'язджае... Каб змяніць сітуацыю, сталі думаць, як прывязаць дзяцей да таго месца, дзе яны жывуць і вучацца, як устанавіць сувязь з малой радзімай, каб яны менавіта з ёй звязвалі сваю будучыню. Мэта была, але не было сродкаў для яе дасягнення, — канстатуе дырэктар. — І тут да нас дайшоў заклік дзяржаўнага тэлеканала «ČT24» далучацца да праекту «Diginaves». Журналісты-прафесіяналы шукалі рэпарцёраў-аматараў, якія будуць асвятляць падзеі ў сваім рэгіёне. У нас нарадзілася смелая думка: а чаму гэтымі рэпарцёрамі не могуць стаць нашы вучні? Падалі заяўку і былі ўключаны ў праект — за шэсць гадоў ён стаў у горадзе і рэгіёне «дамашнім» і знаходзіцца ў цэнтры ўсеагульнай ўвагі.

Дзякуючы далучэнню да праекта школа змагла аснасціць уласную каманду рэпарцёраў тэхнікай і праграмным забеспячэннем. Вядома, размова ідзе пра тэхніку, што была ў карыстанні, не новую, тым не менш самім яе набыць было бы праблематычна. Да таго ж прафесіяналы прадаставілі метадычную і прафесійную дапамогу пачаткоўцам. І настаўнікаў, і школьнікаў навучылі, як працаваць з камерай, як манціраваць сюжэт, расказалі пра рэдактарскую працу і журналісцкую этыку. Тэмай першага самастойнага рэпартажу стаў калядны школьны кірмаш. А ўсяго было падрыхтавана ўжо 124 рэпартажы пра падзеі ў школе і рэгіёне. Яны рэгулярна публікаваліся на сайце Чэшскага тэлебачання, а 10 з іх нават трапілі ў дзяржаўнае вяшчанне ў праграму навін, якая транслюецца на ўсю краіну.

«У нас нарадзілася смелая думка: а чаму гэтымі рэпарцёрамі не могуць стаць нашы вучні?»

Цяпер у школе актыўна працуюць тры групы. У склад кожнай каманды ўваходзяць аператар, рэдактар, асістэнт, фатограф і кіраўнік каманды. Узрост «журналістаў» — ад 9 да 16 гадоў.

З педагогаў іх працу курыруюць настаўнік інфарматыкі, педагог па тэатральным выхаванні і тэхнік. Праект працягваецца ўжо без фінансавай падтрымкі Чэшскага тэлебачання (у школу дасылаюцца толькі чахлы на мікрафон з новымі лагатыпамі канала), але паранейшаму школьнікі могуць атрымаць электронную кансультацыю ад прафесіяналаў. Калі, напрыклад, яны жадаюць зрабіць нейкі сюжэт, але

ў чымсьці сумняваюцца, у іх ёсць магчымасць звярнуцца ў «дарослую» рэдакцыю навін, дзе ім падкажуць, як лепш увасобіць іх ідэю.

— Мы вельмі цэнім гэту дапамогу, — падкрэслівае дырэктар. — Для працы каманды рэпарцёраў патрабуюцца лічбавая камера з выхадам для мікрафона, штатыў, устройства рэзервовага капіравання, камп'ютар або ноўтбук і лічбавы фотаапарат. Заключная праца, мантаж і субцітры робяцца з дапамогай праграмы Pinnacle Studio. Адсутнасць іншага прафесійнага абсталявання замяняе інтэрактыўная дошка: дзеці любяць збірацца побач з ёй, каб абмеркаваць мантаж відэасюжэту. Фінальная версія рэпартажу ствараецца ў выніку агульнай дыскусіі. Кожны мае права голасу...

Па словах Уладзіміра Фойста, акцэнт у іх школе робіцца на праектную дзейнасць. Напрыклад, дзеці здымалі рэпартаж пра тое, як стары школьны сад ператвараецца ў экалагічны. Для гэтага трэба было вывучыць мноства матэрыялаў, разабрацца ва ўсіх нюансах экалогіі і экалагічнага выхавання. Увогуле праца школьнага тэлебачання звязана з вялікай колькасцю вучэбных прадметаў і абласцей: інфарматыкай, чэшскай мовай і літаратурай, гісторыяй, пазакласнай дзейнасцю... Юныя рэпарцёры прысутнічаюць на цікавых уроках, на школьных і пазашкольных мерапрыемствах. Створаныя імі відэасюжэты са школьнага жыцця раз на тыдзень дэманструюцца на перапынках на вялікім экране ў галоўным калідоры. Іх працу ўсе з нецярплівасцю чакаюць...

— За шэсць гадоў журналістамі ў нас папрацавалі больш як 70 вучняў: яны паспрабавалі сябе ў ролі аператараў, сцэнарыстаў, рэдактараў, мантажораў і гукааператараў. Дзеці засвоілі тэхніку, праграмы для апрацоўкі відэа і фатаграфій, набылі рытарычныя навыкі... Ніякага конкурснага адбору ў рэпарцёрскую каманду мы не ладзім. Усе, хто хоча ўдзельнічаць, далучаюцца. Значэнне мае толькі гатоўнасць і жаданне дзіцяці працаваць у пазаўрочны час. Ужо ў працэсе працы высвятляецца, хто і якую функцыю будзе выконваць, што каму бліжэй, — тлумачыць Уладзімір Фойст. — Вялікі плюс — праца школьнікаў у камандзе, набыццё агульных каштоўнасцяў, але пры гэтым ёсць магчымасць рэалізацыі ўласных ідэй.

У школе вучыцца хлопчык з цыганскай сям'і. Раней даводзілася пераконваць яго бацькоў, што дзіця павінна хадзіць у школу. Але як толькі хлопчык увайшоў у каманду рэпарцёраў, стаўленне бацькоў, быццам па ўзмаху чароўнай палачкі, кардынальна змянілася, і яны сталі ці не галоўнымі фанатамі школьнага сайта. «А калі бацькі заходзяць на сайт, яны могуць убачыць там і іншую карысную інфармацыю, якую адміністрацыя імкнецца давесці да іх ведама», — жартуе дырэктар.

За шэсць гадоў існавання праекта ніводная падзея ў рэгіёне не засталася незаўважанай школьнымі рэпарцёрамі.

— Мы зламалі стэрэатып і даказалі, што нават маленькая правінцыйная школа, якая налічвае ўсяго 250 вучняў, можа быць паспяховай і канкурэнтаздольнай, — падкрэслівае спадар Фойст. — Змянілася і свядомасць у нашых вучняў. У якасці ўзнагароды за іх дзейнасць яны атрымалі магчымасць зняць самастойны «вялікі» рэпартаж непасрэдна ў студыі Чэшскага тэлебачання. Пра Пабяжовіцэ і нашу школу даведаліся ва ўсёй Чэхіі. Пералік выгад, якія мы атрымалі ад рэалізацыі праекта, я магу працягваць бясконца: гэта ўменне вучняў працаваць з медыя, арыентацыя ў праблематыцы, выхаванне густу, павышэнне адказнасці і самаацэнкі, прыцягненне ўвагі бацькоў да школьных падзей... Да таго ж створаныя дакументальныя фільмы ўяўляюць сабой каштоўную хроніку як жыцця школы, так і ўсяго рэгіёна... А мінус я бачу толькі адзін — гэта канкурэнцыя паміж школьнікамі. Каб яе не падтрымліваць і не дапускаць, мы пастаянна мяняем у камандзе ролі...

Між іншым праект «Diginа́ves» пацягнуў за сабой новы — «Чэшскі лес — месца, дзе я жыву». Школа атрымала пад яго еўрапейскі грант. Да праекта падключыліся і тры суседнія школы. Вучні ствараюць аўтарскія фільмы пра родныя мясціны. Ідэя заключаецца ў тым, каб ахапіць як мага больш шырокі спектр тэм і ўзбагаціць школьную вучэбную праграму рэгіянальнай тэматыкай.

МЕРКАВАННЕ З АДНОЙ КРЫНІЦЫ — ЯШЧЭ НЕ ІСЦІНА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— Пра медыяадукацыю мы ў нашай школе пачалі задумвацца прыкладна 15 гадоў таму, гэта значыць, за некалькі гадоў да таго, як аднайменны прадмет у Чэхіі стаў абавязковай часткай вучэбнай праграмы, — падкрэслівае спадар Трунда. — Напрыклад, ёй мы займаліся на ўроках чэшскай мовы пры разборы фельетонаў, пры знаёмстве з творчасцю вядомых літаратараў, якія былі яшчэ і журналістамі, — Яна Неруды і Карэла Чапека.

У якасці скразной тэмы медыяадукацыя зараз уключана ў абавязковую вучэбную праграму ўсіх базавых школ (базавыя школы ў Чэхіі разлічаны на вучняў ад 6 да 15 гадоў. — **Аўт.**). На нацыянальным узроўні сфармуляваныя чаканыя вынікі ад укаранення такой адукацыі, але кожная школа сама вырашае, будзе яна рэалізоўваць медыяадукацыю як асобны прадмет ці як тэму, якая вывучаецца ў рамках розных прадметаў, або ў школе будуць камбінаваць абодва гэтыя спосабы.

«Калі медыяадукацыя можа дапамагчы нам у вывучэнні фізікі, хіміі, гісторыі ці музычных дысцыплін, то я не бачу ніякіх прычын, каб яе не выкарыстоўваць».

Трэба мець на ўвазе, што школам у Чэхіі ўласцівая вельмі высокая ступень аўтаноміі: там не існуе адзінай праграмы і адзіных падручнікаў, кожная з іх можа напісаць сваю вучэбную праграму — галоўнае, каб яна адпавядала вызначаным крытэрыям і канчатковым мэтам — развіццю пэўных кампетэнцый у вучняў. Поўную адказнасць за ўсё нясе дырэктар школы.

— Як вы думаеце, ці засвояць дзеці, скажам, закон Ньютана, калі ім пра яго не раскажуць у школе? А ці навучацца працаваць на камп'ютары і карыстацца сацыяльнымі сеткамі? Не сумняваюся, што многія нашы вучні больш упэўнена адчуваюць сябе ў ІТ-свеце, чым іх педагогі. Таму наша задача — навучыць іх не тэхналогіям, а як працаваць са зместам, — кажа педагог. — У вучэбнай праграме напісана, што вучань павінен умець арыентавацца ў праблемах сучаснага свету, але там нічога не сказана пра тое, што дзеці павінны вывучаць вайну ў Югаславіі, украінскі крызіс ці вайну ў Сірыі. Лічыцца, што настаўнік гісторыі — прафесіянал, які сам цудоўна ведае, чаму трэба вучыць дзяцей, каб не прапусціць нічога важнага. Рамкі па часе на тую ці іншую тэму яму таксама ніхто не вызначае. Чэхаў крызіс ва Украіне закрануў самым непасрэдным чынам, паколькі ў нашу краіну прыязджаюць бежанцы з гэтай краіны. І не ўсе медыя і карыстальнікі сацыяльных сетак ставяцца да гэтага факта аднолькава прыязна. Але для нас важна, каб вучні арыентаваліся ў сітуацыі. З гэтай мэтай настаўнік папрасіў вучняў знайсці паведамленне аб падзеях ва Украіне ў розных медыя, але з умовай, што хоць адна крыніца павінна быць замежнай. У класе, дзе давалася заданне, было пяць украінцаў (прычым, як з заходняй, так і з усходняй часткі краіны) і адзін расіянін. Цікава, што ўсе прынесеныя ў клас меркаванні адрозніваліся. Але мы і не шукалі правільнага пункту гледжання. Для нас было важным, каб вучні разумелі, што погляд, агучаны адной з медыякрыніц, не з'яўляецца ісцінай. Медыя могуць абапірацца на розныя меркаванні... У бягучым навучальным годзе праблематыка іміграцыйнай хвалі, якая накрыла Еўрасаюз, безумоўна, будзе на ўроках у цэнтры ўвагі.

Педагогі тлумачаць школьнікам, што ў кожнага чалавека ёсць права на ўласную думку, але меркаванне, якое абапіраецца толькі на асабісты досвед або інфармацыю, пачутую, напрыклад, ад іншых вучняў ці сяброў, не мае такой каштоўнасці, як інфармацыя, што абапіраецца на вывучэнне спецыялізаванай літаратуры, на навуковы досвед або даследаванне.

— Калі медыяадукацыя можа дапамагчы нам у вывучэнні фізікі, хіміі, гісторыі ці музычных дысцыплін, то я не бачу ніякіх прычын, каб яе не выкарыстоўваць, — кажа Іржы Трунда.

Напрыклад, на ўроках фізікі ў школе вучням прапанавалі ацаніць плюсы і мінусы розных энергетычных крыніц з пункту погляду іх уплыву на навакольнае асяроддзе. Школьнікі пералічвалі аднаўляльныя і неаднаўляльныя крыніцы энергіі. Дарэчы, на тэрыторыі Чэхіі знаходзяцца дзве атамныя станцыі — недалёка ад мяжы з Аўстрыяй. Многім суседства з мірным атамам не падабаецца, таму гучаць думкі, што энергію трэба здабываць з вугалю. У аўстрыйскіх медыя таксама даволі часта з'яўляюцца негатыўныя водгукі аб энергетычнай палітыцы чэхаў, гучаць розныя аргументы. Вучні павінны былі азнаёміцца з усімі меркаваннямі, у тым ліку з поглядамі жыхароў рэгіёнаў, дзе здабываецца вугаль. Гэта, дарэчы, рэгіёны з самай складанай экалагічнай сітуацыяй. Да таго ж здабыча вугалю вядзе да высялення прылеглых населеных пунктаў, таму людзі, якія там жывуць, лічаць атамную энергію вельмі добрым варыянтам. Ва ўсім гэтым давялося пераканацца і вучням.

У Вратыслаўскай школе педагогі вельмі актыўна выкарыстоўваюць і магчымасці YouTube. На відэахостынгу яны выкладваюць карысную відэаінфармацыю і даюць вучням спасылкі. На пытанне, а ці не можа шкода ад YouTube, куды «зліваюцца» тысячы відэароліка ў штодня, пераважаць над карысцю, спадар Трунда кажа: «Ні ў якім разе. Менавіта таму мы і займаемся медыяадукацыяй, каб прывіць нашым вучням этыку знаходжання ў сацыяльных медыя. Пытанне пра забарону нейкіх інтэрнэт-рэсурсаў нават не можа ставіцца».

Падчас апошніх летніх канікулаў магчымасцямі YouTube скарысталася настаўніца музыкі. Яна выклала там відэа, дзе вучыла прыгожа спяваць чэшскі гімн. Справа ў тым, што музычная кампазіцыя мае вельмі складаны інтанацыйны малюнак, а таму праблематычная для выканання.

— Наша настаўніца падзяліла ўвесь гімн на часткі: спачатку яна спявала невялікі фрагмент, а затым вядомы музыкант прайграваў адпаведную мелодыю. Такім чынам, ва ўсіх была магчымасць паўтарыць толькі што пачутае. Калі я паглядзеў гэта відэа, то жахнуўся — як жа мы раней дрэнна пелі наш гімн! — усміхаецца дырэктар школы. — Затое 1 верасня, калі ўсе вучні сабраліся на стадыёне, мы сітуацыю выправілі...

Давід Клімеш: «Стваральнікі рэаліці-шоу маніпулююць нашай свядомасцю...»

Дацэнт кафедры маркетынгавай камунікацыі і сувязяў з грамадскасцю факультэта сацыяльных навук Карлава ўніверсітэта, журналіст Давід КЛІМЕШ упэўнены, што для выкладання медыяадукацыі недастаткова напісаць адзін добры падручнік і яе нельга загнаць у адзін навучальны курс. Медыяадукаванасць можа быць рэкламнай, фільмавай, электронай і іншай.

— Вучням можна расказаць, як стваральнікі папулярных рэаліці-шоу маніпулююць свядомасцю прыхільнікаў такога тэлепрадукту. Да стварэння шоу прыцягваюцца добрыя псіхолагі, якія мадэлююць сітуацыі, правакуюць канфлікты паміж удзельнікамі, настолькі дэталёва прапрацоўваюць усе дэталі, каб у гледачоў было адчуванне ўласнай прысутнасці па іншы бок экрана, — кажа выкладчык універсітэта. — Дарэчы, бацькі ў Чэхіі вельмі сочаць за тым, што іх дзеці глядзяць па тэлебачанні, але зусім не ведаюць, што яны шукаюць у інтэрнэце. Прапануйце школьнікам ахарактарызаваць уласнае інфармацыйнае асяроддзе. Якія крыніцы інфармацыі стаяць у іх на першым месцы? Не сумнявайцеся, што гэта будуць сацыяльныя сеткі. Таму дзецям трэба тлумачыць, што не ўся інфармацыя ў інтэрнэце — раўназначная.

Матэрыялы паласы падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*

Знайсці сябе

СМАК НА ВУСНАХ,

або Хто ведае, якім павінна быць сапраўднае малако

Штогод Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт і Мінскае гарадское аб'яднанне прафсаюзаў праводзяць сярод спецыялістаў масавых прафесій конкурс пад назвай «Мінскі майстар». Ужо 12 гадоў падчас гэтага мерапрыемства вызначаюць найлепшых прафесіяналаў у розных сферах. Сёлета пераможцамі сталі 32 чалавекі. Сярод іх — 30-гадовая інжынер-хімік вытворчай лабараторыі Мінскага малочнага завода №1 Таццяна ЛАПІЦКАЯ. Карэспандэнты «Чырвонкі. Чырвонай змены» завіталі на працу да трыумфатаркі і даведаліся, якім на смак павінна быць «правільнае» малако.

«Людзьмі ў белых халатах» у нас звычайна называюць дактароў. Але супрацоўнікі малаказаводаў таксама могуць прэтэндаваць на такое званне: у лабараторыі, дзе працуе Таццяна, усё, як у аперацыйнай, толькі што работнікі без пальчатак.

— Дзесяць гадоў таму я прыйшла сюды працаваць кантралёрам харчовых прадуктаў, — узгадвае Таццяна. — Да гэтага вучылася ў Магілёўскім дзяржаўным універсітэце харчавання па спецыяльнасці «інжынер-тэхнолаг малака і малочных прадуктаў». Як мінчанка апынулася ў Магілёве? Усё проста: яшчэ падчас вучобы ў школе ў нас былі заняткі ў вучэбна-вытворчых камбінатах. Мне давялося выбіраць паміж прафесіямі швачкі і лабаранта хіміка-бактэрыялагічнага аналізу. Шыць з дзяцінства не люблю, таму зрабіла выбар на карысць працы ў лабараторыі. Прайшла практыку на малочным заводзе №2, атрымала спецыяльнасць і — галоўнае — зразумела, што такая праца мне падабаецца. Вырашыла звязаць будучыню з харчовай прамысловасцю і адправілася ў Магілёў атрымліваць профільную вышэйшую адукацыю. Таму вырашальную ролю тут адыграла школа.

Галоўныя абавязкі інжынера-хіміка на малочным заводзе — правядзенне арганалептычных і фізіка-хімічных выпрабаванняў кожнай партыі гатовай прадукцыі. Першы тэрмін азначае ўсяго толькі вызначэнне якасці пры дапамозе органаў пачуццяў: каштаванне на смак, праверка колеру, кансістэнцыі, паху... Фактычна, інжынер-хімік — гэта прафесійны дэгустатар. Які, акрамя таго, можа правесці і больш складаны аналіз з дапамогай спецыяльнай апаратуры.

— Насамрэч дэгустацыя — даволі складаны працэс, — распавядае Таццяна. — Сёлета ў Слуцку адбіралі такіх супрацоўнікаў малочных заводаў з усёй краіны, якія маюць прыродныя здольнасці да арганалептыкі. Я трапіла ў іх лік і паехала вучыцца на спецыяльныя курсы ў Каўнас. Там нам тлумачылі, як правільна каштаваць прадукцыю, якія патрэбны для гэтага ўмовы. Напрыклад, у ідэале дэгустацыя праводзіцца ў спецыяльным памяшканні, сцены якога пафарбаваны ў белы колер, каб нічога не адцягвала ўвагу. Ніякіх пабочных пахаў, гукаў. Тэставы прадукт падаецца дэгустатару праз спецыяльнае акенца — гэта цэлая навука!

Фота Надзеі БУЖАН.

Дарэчы, каштаваць прыходзіцца нямала. Уся прадукцыя завода (а гэта малако, кісламалочныя прадукты, масла, сыры, смятана, тварог, маянэз, глазураваныя сыркі, ёгурты, дэсерты, пудынгі, жэле) праходзіць праз смакавы кантроль Таццяны. Па яе словах, галоўны крытэрый «правільнасці» прадукцыі — адсутнасць любых пабочных прымесяў, смакаў, пахаў.

— Яшчэ ёсць шэраг фізіка-хімічных аналізаў, якія мы праводзім, — расказвае інжынер-хімік. — Самыя простыя — кіслотнасць, шчыльнасць, долю тлушчу — вызначаюць кантралёры, гэта робіцца за пяць хвілін. Мая зона адказнасці — больш складаныя тэсты, напрыклад, вызначэнне масавай долі цукрозы і цукру, бялку. Гэтыя аналізы займаюць каля трох гадзін. Увогуле, кожны прадукт праходзіць тэсты мінімум тройчы: на стадыях падрыхтоўкі, прыгатавання і фасоўкі. Таму працы хапае.

Фінал конкурсу «Мінскі майстар», перамогу ў якім атрымала Таццяна, складаўся з двух этапаў: практычнага і тэарэтычнага. Падчас першага ўсім канкурсантам раздавалі малочную прадукцыю, якую трэба было пратэсціраваць. Другая частка — пытанні па білетах. Дзяўчына прызнаецца, што шмат чаго з універсітэцкай праграмы прыйшлося паўтараць, бо надта ж шмат нюансаў у рабоце інжынера-хіміка. Да ўдзелу ў конкурсе супрацоўніца 1-га малаказавода рыхтавалася спецыяльна, як сапраўдны спартсмен. У выніку — упэўненая перамога і шанаванне. Прафкам завода выпісаў Таццяне грашовую прэмію, а Мінскае гарадское аб'яднанне прафсаюзаў падарыла памятныя сувеніры і тэлевізар.

«У ідэале дэгустацыя праводзіцца ў спецыяльным памяшканні, сцены якога пафарбаваны ў белы колер, каб нічога не адцягвала ўвагу. Ніякіх пабочных пахаў, гукаў. Тэставы прадукт падаецца дэгустатару праз спецыяльнае акенца — гэта цэлая навука!»

Праца на малочным заводзе Таццяну задавальняе. Як яна тлумачыць, сядзець у лабараторыі і штодня рабіць адзін і той жа аналіз ёй не падабалася б. Тут ёсць рух, што ні дзень, то новыя задачы... Акрамя таго, у лабараторыі завода працуюць у асноўным маладыя дзяўчаты, а добры калектыў — палова поспеху. Не апошнюю ролю адыгрывае і заробак: у сярэднім інжынер-хімік зарабляе 6 мільёнаў рублёў. Але Таццяна не выключае таго, што зменіць профіль — яна з задавальненнем паспрабавала б сябе на пасадзе тэхнолага на сваім прадпрыемстве, але гэта ўжо справа часу і плённай працы.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
lyskavets@zviazda.by

НА АХОВЕ ПРАВАПАРАДКУ — «СТРАЛА»!

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Працягваючы тэму парушэнняў, старшы інспектар адзначае, што перавышэнні хуткасці характэрныя для раніцы буднага дня, калі людзі спяшаюцца на працу. На жаль, не ўсе кіроўцы разумеюць, што некалькі сэканомленных хвілін могуць каштаваць ім здароўя ці нават жыцця. Між тым менавіта перавышэнне хуткасці — адна з самых распаўсюджаных прычын ДТЗ.

...Экіпаж «Стралы» выязджае за горад у вёску Шчомысліца. Машыны тут праязджаюць рэдка. Здаецца, ніякіх правілаў не парушаюць. Праз некалькі хвілін мы ўжо знаходзімся на дарозе, якая пралягае праз лес. Інспектар спыняе аўтамабіль, які першым трапіў нам на вочы, і просіць кіроўцу паказаць дакументы. З сабой у таго не ўсе патрэбныя паперы: не хапае сертыфіката на праходжанне тэхагляду. Пакуль Станіслаў Казаеў афармляе пратакол, яго калега Аляксей Гаўрыленка спыняе машыну, за рулём якой сядзіць мужчына, не прышпілены рэменем бяспекі. І першы, і другі парушальнікі сваю віну прызналі і штрафы заплацілі на месцы без лішніх слоў і эмоцый. Інспектары кажуць, што так бывае не заўсёды.

Далей мы перамяшчаемся на шашу. Тут усё па-іншаму: машын больш і парушэнні будуць у асноўным хуткаснымі. Таму капітан Гаўрыленка, нягледзячы на праліўны дождж, бярэ прыбор, які фіксуе хуткасць аўтамабіляў, і выходзіць на дарогу. На мокрым асфальце тармазны шлях машын значна павялічваецца, таму менавіта падчас дажджу аўтааматары павінны выбіраць больш стрыманы стыль кіравання, каб мець магчымасць своечасова спыніцца. Першы парушальнік трапляецца нам ужо праз некалькі хвілін. У спалоханых вачах маладога хлопца чытаецца нямое пытанне: што я зрабіў? Гэта яго першае парушэнне, ён нервуецца і блытаецца ў адказах пры запаўненні пратакола. Як высветлілася, хлопец па прафесіі кіроўца. І ў той момант ён якраз ехаў на працу ў Фаніпаль. Напэўна, сустрэча з супрацоўнікамі «Стралы» надоўга адаб'е ў яго жаданне перавышаць хуткасць.

Калі мужчыны-кіроўцы ў той дзень спыняліся па патрабаванні інспектараў адразу ж, то жанчына, якая перавысіла хуткасць, спачатку зрабіла выгляд, што ўвогуле не заўважыла інспектара, і працягвала рух. Метраў праз сто, аднак, усё ж прытармазіла, выйшла з аўтамабіля і пачала амаль што крычаць: маўляў, навошта спынілі — я ж нічога не зрабіла! Аляксей Гаўрыленка растлумачыў жанчыне, што яна перавысіла хуткасць, паказаў на экран прыбора, які ўсё зафіксаваў. Але тая і слухаць не хацела, махала рукамі ў бок знака «80».

— Гэты знак стаіць на ўездзе ў Мінск, а вы выязджалі з горада, правільна? На выездзе вам такія знакі сустрэліся? Не, — працягваў тлумачыць сітуацыю інспектар.

Першы парушальнік трапляецца нам ужо праз некалькі хвілін. У спалоханых вачах маладога хлопца чытаецца нямое пытанне: што я зрабіў? Гэта яго першае парушэнне, ён нервуецца і блытаецца ў адказах пры запаўненні пратакола.

Жанчына, здавалася, прапускала словы міма вушэй і з кожнай фразай яе голас рабіўся гучнейшым. — Ужо і на 79-ці людзей ловіце? — не пераставала яна правакаваць канфлікт.

— Тут дапушчальная хуткасць — 60, — падключыўся да размовы Станіслаў Казаеў.

— А вось паглядзіце, як людзі едуць, чаму іх не спыняеце? — парушальніца нават не думала супакойвацца і працягвала нападаць на супрацоўнікаў «Стралы»: — Што вы мне там так шмат пішаце? Вы б лепш «джыпы» крутыя штрафавалі, а не звычайных людзей!

Фота Аліны КОБЕЦ.

Дождж працы не перашкода.

— Мы зараз працуем з вамі і не можам спыняць іншыя машыны, — спакойна адказаў інспектар.

Як толькі пратакол быў афармлены і жанчына паехала далей, капітан Гаўрыленка падзяліўся думкамі: «Вы, напэўна, заўважылі, што яна спрабавала справакаваць канфлікт усімі магчымымі спосабамі. Некаторыя кіроўцы неадэкватна сябе паводзяць і нават праяўляюць агрэсію. З такімі людзьмі трэба паводзіць сябе вельмі асцярожна: кожнае слова ў размове падбіраць, быць стрыманым і ветлівым і не паддавацца на правакацыі».

Вяртаючыся ў горад, мы напаткалі матацыклістаў. Маладыя хлопцы хуткасці не перавышалі, і з дакументамі ў іх усё было ў парадку.

— Гэта дысцыплінаваныя кіроўцы, з такімі рэдка праблемы бываюць, — кажа Станіслаў Казаеў. — А правілы звычайна парушае моладзь, што садзіцца на матацыкл «па прыколе», або гаспадары старэнькіх мадэляў двухколавай тэхнікі, на якой ездзіць увогуле небяспечна.

Ганна КУРАК,
студэнтка IV курса
Інстытута журналістыкі БДУ.

Азбука бяспекі

ЛІХАЧЫЦЬ НАЙПЕРШ МОЛАДЗЬ. ЯНА Ж І ГІНЕ Ў ПЕРШУЮ ЧАРГУ...

Старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе спецыяльнага падраздзялення ДПС «Страла» МУС Вольга АМІНАВА:

— Як паказвае аналіз аварыйнасці, дарожна-транспартныя здарэнні на мотатэхніцы часта здзяйсняе моладзь ва ўзросце ад 16 да 25 гадоў. Яна ж у асноўным і гіне ў такіх аварыях. Для маладых кіроўцаў, якія яшчэ не маюць дастатковага вопыту ваджэння, характэрна грэбаванне элементарнымі правіламі бяспечных паводзін на дарозе. Да асноўных прычын дарожна-транспартных здарэнняў з удзелам двухколавай тэхнікі можна аднесці кіраванне транспартам без права на кіраванне і навыкаў ваджэння; язду на няспраўным і тым, які не прайшоў тэхнічны агляд, «жалезным кані»; перавышэнне хуткасных рэжымаў.

За ваджэнне без правоў кіроўцы пагражае штраф ад 900 тысяч да 3,6 мільёна рублёў, а за паўторнае такое ж парушэнне закона цягам года можна пазбавіцца 9 мільёнаў рублёў. За кіраванне мотатранспартам і перавозку на ім пасажыраў без ці з незашпіленымі моташлемамі пагражае штраф да адной базавай велічыні (сёння 180 тысяч рублёў). Паўторнае такое ж парушэнне цягам года пацягне павелічэнне адказнасці — ад 2 да 5 базавых велічынь (ад 360 да 900 тысяч рублёў).

ТОЛЬКІ ЛІЧБЫ

Толькі за восем месяцаў года па віне кіроўцаў мотатранспарту адбылося 208 дарожна-транспартных здарэнняў, у якіх 31 чалавек загінуў і 212 атрымалі раненні. У 38 з гэтых выпадкаў матацыклісты знаходзіліся за рулём нападпітку.

Сяргей РАСОЛЬКА.
rs@zviazda.by

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
22 10 2015 г.

Сакрэты строю

СТЫЛЬ, ПАКІНУТЫ НАМ ПРОДКАМІ

Сёння моладзь часта можна сустрэць і падчас вучобы, і ў вольны час адзетую ў так званыя «вышымайкі». А на фальклорных мерапрыемствах, фэстах і традыцыйных святах — у вышыванках. Першыя з'явіліся нядаўна і адразу набылі папулярнасць, хоць іх нельга блытаць з вышыванкамі. Па-першае, вышымайка — сучасны трыкатажны выраб, на які нанесены прынтавы арнамент ці машынная вышыўка, а вышыванка — традыцыйная кашуля, пашытая з ільняной або баваўнянай тканіны і ўпрыгожаная ручной ці машыннай вышыўкай. Па-другое, у іх розныя функцыі: вышыванка глядзіцца ў комплексе святочнага адзення, а вышымайка мае больш вольны фармат і будзе да месца падчас адпачынку.

— У нас найбольшым попытам сярод моладзі, зразумела, карыстаюцца вышымайкі, таму што яны значна больш танныя, чым сапраўдныя вышыванкі, — расказвае **Павел БЕЛАВУС, заснавальнік крамы symbal.by.** — Для іх мы выкарыстоўваем майкі з бавоўны сусветна вядомай кампаніі, якія набываем за мяжой, а затым наносім прынты спосабам шаўкаграфіі праз тэрмаперанос. А вось вышыванкі, якія мы прадаём, вырабляе дзяржаўнае прадпрыемства «Скарбніца». Дарэчы, мы нядаўна прыдумалі нешта сярэдняе паміж вышыванкай і вышымайкай — «каўнерка» альбо пола-кашуля з вышыўкай. Яна выдатна падыходзіць як для штодзённага нашэння, так і для дзелавога стылю.

Можна звярнуцца да майстрыхі, калі вы хочаце мець эксклюзіўны выраб. Каб даведацца, як робіцца такая кашуля, мы пагутарылі з **Юліяй ЛІТВІНАВАЙ, майстрыхай традыцыйнага адзення.**

— Мне падабаецца, што сёння мы імкнёмся да «свайго» адзення, беларускага стылю, — расказвае Юлія. — Сапраўдны беларускі строй робіцца пераважна з натуральных матэрыялаў (лён, сукно, баваўна) і мае ў сабе цэлы комплекс адзення, якое адпавядае пэўнаму ўзросту і сацыяльнаму статусу. А колькі розных варыяцый яго ёсць! Зазірнуўшы толькі ў альбом прафесара Міхася Раманюка «Беларускае народнае адзенне», можна сцвярджаць, што ў нашых продкаў пачуццё густу было прыроднае: адзенне на іх выглядае прыгожа, гарманічна і стыльна. Таму хочацца як мага больш дакладна аднавіць той ці іншы строй.

Напэўна, любоў да рукадзелля перайшла да дзяўчыны ад матулі, якая і навучыла вышываць крыжыкам. Першыя вышыванкі — вясельныя кашулі для сябе і будучага мужа — майстрыха рабіла вельмі доўга.

«На звычайную мужчынскую вышыванку патрэбна прыкладна два-тры тыдні. Зразумела, што жаночую кашулю раблю даўжэй, бо на ёй болей вышыўкі».

— Цяпер пераважна звяртаецца моладзь. Асабліва папулярныя традыцыйныя вясельныя строі. Хтосьці прыходзіць з гатовай ідэяй, а іншым трэба дапамога — падбіраем штосьці з таго ж альбома Раманюка ці звяртаемся да музейных фотаздымкаў. Большасць аддае перавагу геаметрычнаму арнаменту і крамнай ільняной тканіне. На звычайную мужчынскую вышыванку патрэбна прыкладна два-тры тыдні. Зразумела, што жаночую кашулю раблю даўжэй, бо на ёй болей вышыўкі.

— Чаму, на ваш погляд, сталі такімі папулярнымі вышыванкі і вышымайкі? — пытаюся ў Юліі.

— Напэўна, моладзь хоча вылучыцца. Калі мы надзяваем строй, то гучна заяўляем: «Мы з гэтай зямлі, мы з Беларусі!» Але звычайна такое адзенне не на кожны дзень: гэта святочнае, дарагое ўбранне. Мне прыемна хадзіць у строі на розныя святы, фэсты. Слова «строй» гаворыць само за сябе: тут і абутак, і адзенне, і ўпрыгажэнні — усё павінна быць «стройным», у адным стылі. Такое адзенне абавязвае да іншых рухаў, паводзінаў, яно быццам выпраўляе — адразу ж хочацца выпрастаць спіну, трымацца годна. Цешыць, што сёння вопраткі з традыцыйнымі элементамі стала болей, і нават сучаснае адзенне патроху набывае беларускую адметнасць і стыль. Вельмі хацелася б, каб харастваво традыцыйнага беларускага строю больш папулярызавалася сярод моладзі, а разам з ім і жаночыя рамёствы, каб з'яўляліся цэнтры, школы, дзе гэтым рамёствам можна навучыцца.

Першыя вышыванкі — вясельныя кашулі для сябе і будучага мужа — Юлія Літвінава рабіла вельмі доўга.

Ілья ФАЛЯЖЫНСКІ, студэнт IV курса інжынерна-эканамічнага факультэта БДУІР:

— Адзенне з вышыўкай падабаецца. Бо гэтыя ўзоры прыйшлі да нас ад продкаў, і калі я апранаю яго, гэта сведчыць, што я з павагаю стаўлюся да гісторыі сваёй краіны. Традыцыйны беларускі строй альбо нават звычайная вышымайка адметныя: можна вылучыцца, прыцягнуць увагу да сябе за мяжой.

Ірміна ЛАСТОЎСКАЯ, менеджар:

— У маім гардэробе ёсць некалькі белых маек з вышыўкай, так званых вышымаек. Яны зроблены з густам і пачуццём меры. Тым больш выканаы з натуральнага лёну. Прыемна прайсціся па горадзе ў такім стыльным адзенні.

Ганна ШЫБУТ, студэнтка V курса Інстытута журналістыкі БДУ:

— Нашу вышыванкі, бо гэта народнае адзенне, а я люблю ўсё, што звязана з традыцыйнай культурай, штосьці аўтэнтычнае. Падабаюцца сваёй прастатой і прыгажосцю.

Андрэй ФІЛІПЧЫК, праграміст:

— У мяне ёсць вышыванка, пашыў яе на заказ на вяселле сяброў. Цяпер надзяваю на святы і фестывалі кшталту «Камяніцы». І ёсць вышымайка, якую нашу без нагоды, бо падабаецца дызайн. Яна стыльная, прыгожая, але я стаўлюся да яе, як да звычайнай майкі. А вось вышыванка — гэта павага да традыцый продкаў. Мне здаецца, цудоўна, калі мы праз адзенне вяртаемся да каранёў, не забываемся на сваю культуру і папулярызуем яе.

Юлія БУКЕЛЬ,
студэнтка V курса Інстытута журналістыкі БДУ.

Будзь у трэндзе!

НЕ ПРОСТА АРНАМЕНТ НА АДЗЕННІ

Як маладыя аднаўляюць спадчыну і ствараюць гісторыю

Яшчэ некалькі гадоў таму адзенне з беларускім арнаментам знайсці было неверагодна складана. Але раптам усё змянілася: яно ў трэндзе, яго прадаюць адразу некалькі крам па ўсёй краіне. Адзін з вытворцаў прадукцыі з вышыўкай — маладая беларуская кампанія Fainy.by («Файны. бай»), створаная на базе стартап-цэнтра Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта.

Офіс праекта знаходзіцца ў будынку навукова-тэхналагічнага парка БНТУ «Палітэхнік». Сам парк быў створаны як вялікі комплекс па развіцці інавацыйнага бізнесу. Стартап-цэнтр, які распачаў працу ў 2013 годзе, — яго частка. Маладым бізнесменам у тэхнапарку прадастаўляюць памяшканні і аказваюць усю неабходную дапамогу (складаюць бізнес-планы, праводзяць маркетынгавыя даследаванні, шукаюць фінансаванне і інш.) для развіцця сваёй справы. У 2012 годзе ўстанова атрымала ўзнагароду як самы лепшы суб'ект падтрымкі прадпрымальніцтва ў краіне.

— У БНТУ навучаецца вялізная колькасць студэнтаў па самых розных спецыяльнасцях: дызайнеры, будаўнікі, інжынеры, менеджары, — расказвае **памочнік генеральнага дырэктара тэхнапарка, кіраўнік стартап-цэнтра Віталь ГМЫРАК.** — Група навучэнцаў прыйшла да нас з наступнай ідэяй: стварыць агульны карпаратыўны стыль як для ўніверсітэта, так і для прадстаўнікоў кожнай яго спецыяльнасці. У славутых ВНУ Заходняй Еўропы і Амерыкі гэта норма. Студэнты з задавальненнем носяць на пінжаках, світарах, кашулях гербы, якія сведчаць аб прыналежнасці да ўстановы. Мы хацелі зрабіць нешта падобнае на падставе сімволікі БНТУ.

Усё пачыналася менавіта з такіх футболак — з лагатыпам БНТУ.

Адзін з першых вынікаў працы — футболка-пола з вышыўкай на грудзях. У яе аснове — абрысы галоўнага корпуса ўніверсітэта. Унізе — перакрыжаваныя малаток і штангенцыркуль (так у савецкія часы выглядаў металічны значок інжынера, які выдавалі ўсім выпускнікам тэхнічных ВНУ. Раней насіць яго было вялікім гонарам, цяпер жа ранейшай сімволіцы даюць новае жыццё пры дапамозе вышыўкі).

Праект даволі хутка набраў абароты, прадукцыя займела вялікую папулярнасць сярод студэнтаў. У жніўні на тэрыторыі ўніверсітэта адкрыўся кіёск з таварамі, зробленымі камандай Fainy.by.

«Зараз стваральнікі праекта абмяркоўваюць магчымасць працы з айчыннай асновай — ільняной. Калі атрымаецца, прадукт Fainy.by стане цалкам беларускім».

— Мы спецыяльна наносім сімволіку на прадметы, якімі карыстаюцца штодзённа, — тлумачыць **куратар праекта Fainy.by, сёлетняя выпускніца спецыяльнасці «Інавацыйны менеджмент» прыборабудаўнічага факультэта Ксенія САФРОНАВА.** — Гэта футболкі, пола, бейсболкі, байкі і сумкі.

Стваральнікі праекта распавядаюць, што вышывальная вытворчасць у тэхнапарку існавала і раней. Праўда, працавала па іншым прынцыпе — кліенты самі прыходзілі і заказвалі рэчы па ўласным дызайне. Самае сучаснае абсталяванне дазваляла выканаць любое жаданне, але маркетынг быў пасіўным. Моладзь з Fainy.by перавяла яго на новыя рэйкі і цяпер сама рухае на рынак уласны прадукт.

— Калі мы ўбачылі, што справа пайшла нядрэнна, то пачалі задумвацца над наступнымі крокамі, — працягвае Віталь Гмырак. — Сваю другую лінейку прадукцыі вырашылі прысвяціць вышыванкам. Буду шчыры: галоўнае, што падштурхнула нас да такога выбару, — трэнд. Ні для кога не сакрэт, што рэчы з нацыянальным арнаментам сёння хутка набіраюць папулярнасць, і мы вырашылі гэтым скарыстацца.

Галоўная канкурэнтная перавага, па словах стваральнікаў, — у каляровасці.

Вядома, стваральнікі ўлічвалі і тое, што канкурэнцыя на рынку даволі сур'ёзная, таму паспрабавалі зрабіць нешта сваё, непаўторнае. Акрамя непасрэдна вышыўкі, асаблівасць рэчаў ад Fainy.by ў іх каляровай гаме. Калі астатнія вытворцы звычайна спыняюцца на традыцыйных белым і чырвоным колерах, то тут прадстаўлена цэлая палітра: сіняя, жоўтыя, зялёныя... Спалучэнне такіх колераў з арнаментам выглядае па-свежаму і сучасна, хоць і не так аўтэнтычна.

«Ні для кога не сакрэт, што рэчы з нацыянальным арнаментам сёння хутка набіраюць папулярнасць, і мы вырашылі гэтым скарыстацца».

— Вядома, мы не проста так бралі з галавы ці інтэрнэту які-небудзь арнамент і вышывалі яго на футболках, — тлумачыць Ксенія Сафронава. — Напачатку селі і дасканала вывучылі кнігу этнографа Міхаіла Кацара «Беларускі арнамент», каб разбірацца ў тэме і ведаць, што азначаюць розныя элементы. Вось, скажам, футболка з сімвалам «маці» — паехаў куды-небудзь далёка, а твая маці заўсёды побач. Яшчэ ёсць «хлеб», «сонца» і шмат іншага. Спалучэнні колераў таксама навеяны прыродай роднага краю: сакавіты жоўты — як першы дзьмухавец, пяшчотны валошкавы — нібы блакіт родных азёраў...

Тэхнічна працэс выглядае наступным чынам: напачатку дызайнеры Fainy.by распрацоўваюць малюнак, які будзе нанесены на тканіну. Пасля праграмісты пішуць спецыяльны алгарытм для швейнай тэхнікі, па якім машына будзе ствараць узор (умоўна кажучы, у праграму закладваецца рух іголкі, колькасць сцяжкоў і іншыя параметры). У якасці асновы выкарыстоўваюцца футболкі, якія заказваюць за мяжой. Але зараз стваральнікі праекта абмяркоўваюць магчымасць працы з айчыннай асновай — ільняной. Калі атрымаецца, прадукт Fainy.by стане цалкам беларускім.

Варта заўважыць, што кошт тавараў кампаніі пакуль значна меншы, чым у многіх іншых фірмаў. Стваральнікі тлумачаць гэта тым, што на стадыі выхаду на рынак выдаткі на вытворчасць зусім не вялікія. Сама каманда складаецца з некалькіх чалавек: менеджара, дызайнераў, фатографа, маркетолага, адміністратара сайта. Усе яны студэнты. Буйным жа фірмам прыходзіцца «карміць» вялікі штат, што павялічвае сабекошт. Таксама нізкі цэннік абгрунтоўваецца тым, што Fainy.by мае магчымасць карыстацца абсталяваннем тэхнапарка на льготных умовах.

— У любым выпадку, справа тут не толькі ў грашах, — дадае Віталь Гмырак. — Галоўнае, што мы збіраем у адным месцы таленавітых людзей, кожны з якіх хоча развівацца ў сваім кірунку, і аб'ядноўваем іх намаганні ў адно рэчышча. Тое, што студэнты павінны вучыцца на рэальных праектах, — гэта сусветны досвед, так робяць у самых славутых і буйных універсітэтах. І мы таксама даём нашым наватарам такую магчымасць — працу над праектамі разам з прафесійнымі ментарамі і настаўнікамі.

Планы на будучыню стваральнікі Fainy.by акрэсліваюць аптымістычна — яны хочуць стаць вядомым у Беларусі дызайнерскім брэндам.

— Мы спадзяемся як мага хутчэй выйсці за межы стартап-цэнтра БНТУ, — кажа Віталь. — У гэтым і заключаецца сэнс: як толькі праект вырастае да сур'ёзных маштабаў, выходзіць на свабодны рынак, ён павінен пакінуць сцены ўстановы. А на яго месца змогуць прыйсці іншыя студэнты са сваімі ідэямі.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
lyskavets@zviazda.by

Галоўнае — адважыцца!

АЎТАСТОПАМ — ПРАЗ ПАЛОВУ ЕЎРОПЫ

Іх дзесяць чалавек — дзесяць цікавых асоб, закаханых у мастацтва, якія не ўяўляюць свайго жыцця без яго. Па дарозе да акіяна студэнты Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў за тры тыдні вандроўкі наведалі Варшаву, Вену, Ніцу, Венецыю, Марока, Більбаа, Сан-Себасцьян, Мадрыд і Лісабон, праехаўшы амаль 5 тысяч кіламетраў. Яны не выкарыстоўвалі грамадскі транспарт: толькі аўтастоп, толькі хардкор. Зразумела, што не шмат знойдзецца людзей, якія дазволяць у сябе начаваць такой колькасці падарожнікаў, ды і ехаць такім чынам усім разам немагчыма, таму мастакі падзяліліся. Падчас гэтага доўгага падарожжа адбылося шмат добрых і запамінальных сустрэч, пра якія сёння і распавядзе мастачка Настасся ЧАРАПАНАВА.

Іх мэтай быў акіян!

— Як з'явілася ідэя адправіцца да акіяна?

— Мы з сябрамі хацелі паглядзець свет, але ў нас было зусім мала грошай, таму адразу вырашылі ехаць аўтастопам. Я, у прынцыпе, заўсёды так вандрую.

— Што запомнілася, дзе вы былі?

— Выязджалі мы ў розны час. Першы раз сустрэліся ў Вене. Там мы трапілі ў Музей Хундэртвасэра (1928—2000), геніяльнага і своеасаблівага мастака, аднаго з маіх куміраў. У Венецыі былі на Венецыянскай біенале — грандыёзнай міжнароднай мастацкай выставе, на якой можна ўбачыць працы мастакоў з усяго свету. Гэта адзін з самых вядомых форумаў сусветнага мастацтва, які праводзіцца раз на два гады. У Ніцу ехалі на электрычках, таму што аўтастоп у Італіі вельмі дрэнны. Там мы нікуды не хадзілі, а проста ляжалі на пляжы. Зноў падзяліўшыся, планавалі трапіць у Більбаа, але нейкім цудоўным чынам сустрэліся ўсе разам на запраўцы ў Сан-Себасцьяне, пасля чаго накіраваліся ў Лісабон.

— Што там уразіла больш за ўсё?

— Вядома ж, акіян. Ён бязмежны. Абавязкова з'ездзіце ў Лісабон. Гэта нешта нерэальнае, ажно перахоплівае дыханне. Не магу перадаць словамі, проста трэба паехаць туды і паглядзець на гэта самому.

— Чаго табе найперш не хапала ў падарожжы?

— Мне хацелася баршчу, бо мы не гатавалі, а проста елі фаст-фуд ці куплялі ежу ў супермаркеце. Было складана. З намі ездзіла дзяўчына-вегетарыянка. Вось ёй было асабліва цяжка...

Але падчас падарожжа нам давялося сустрэць вельмі шмат цікавых людзей: музыкаў, мастакоў, якія стараліся нам дапамагчы. І калі мы казалі ў Італіі, што едзем з Беларусі аўтастопам, мясцовыя жыхары былі вельмі шакіраваныя гэтым паведамленнем. Вядома, прасцей сесці ў самалёт, але калі ты праехаў 5 тысяч кіламетраў такім чынам, разумееш, што гэта неверагодна крута. Здаралася, што мы стаялі на ўзбочыне дарогі і сем гадзін, а было і такое, што пяці хвілін не праходзіла, як машына спынялася.

— Дзе вы знаходзілі прытулак, як жылі?

— У Вене за хостал мы плацілі 16 еўра, у Венецыі — 22, у Ніцы — 5. У Лісабоне жылі чатыры дні. Хостал там вельмі цікавы: прыйсці ў яго можна хоць усёй сям'ёй. Мы спалі па двое на ложку, такім чынам эканомілі. На выхадных ноч каштавала даражэй і цэннік уздымаўся да 14 еўра.

— У тваіх працах адлюстроўваюцца эмоцыі і ўражанні ад нядаўніх паездак?

— Так. Калі я прыехала, мяне накрыла хваляй натхнення — я зрабіла партугальскую серыю. У карцінах адчуваецца пах марскога брызу. Серыя яшчэ не скончана, бо я працягваю маляваць...

Настасся ЖУХАРАВА,
студэнтка IV курса Інстытута журналістыкі БДУ.

Белае і чорнае

КАНТРАСТЫ ЧОРНАГА КАНТЫНЕНТА,

альбо Ноч у паліцэйскім участку і бананы са смакам бульбы

Калі з'яўляецца нагода паехаць у падарожжа, брастаўчанка Таццяна ГЕНДЗЕЛЬ доўга не раздумвае. Яе філасофія простая: збірай рэчы ў заплечнік ды выходзь на трасу. Аўтастопшчыца аб'ехала каля 20 краін, апошняе падарожжа дык увогуле занесла Таню на Чорны кантынент, дзе яна правяла чатыры месяцы, за якія пабывала ў Кеніі, Угандзе, Танзаніі, Намібіі і Замбіі. Нядаўна дзяўчына вярнулася ў Беларусь. Свежымі ўражаннямі яна падзялілася з чытачамі «Чырвонкі. Чырвонай змены».

— Як ты адважылася на такое падарожжа?

— Афрыка заўжды была маёй марай — недасяжнай і цяжкадаступнай, вандроўка доўга адкладвалася на «пасля». Калі стала глядзець авіяквіткі ў Індыю, то выпадкова знайшла вельмі танны ва Уганду. Я загарэлася і пачала шукаць спадарожнікаў. За гэты час цэны на квіткі выраслі, затое «намаляваліся» даволі танныя варыянты дабрацца да сталіцы Кеніі — Найробі. Пасля я вырашыла не абмяжоўвацца дзвюма краінамі і «замахнулася» на Танзанію, Замбію і Намібію. У мяне было два месяцы, каб падрыхтавацца, таму я шмат чытала і пакрысе складала даведнік, у якім пазначала цікавыя мясціны і неабходныя кантакты.

— Ці лёгка было атрымаць візу?

— Так, іх выдаюць па прыбыцці на мяжу альбо ў аэрапорце, трэба толькі заплаціць на нашы грошы каля 750 тысяч рублёў, а ў Намібію віза для беларусаў дык увогуле бясплатная. Могуць папрасіць дакумент, які сведчыць, што вы зрабілі прышчэпку ад жоўтай ліхаманкі. У краінах, дзе была я, гэтае патрабаванне мела рэкамендацыйны характар, а вось у Паўднёва-Афрыканскую Рэспубліку без такога дакумента трапіць цяжка.

— Афрыка — дарагі кантынент для адпачынку?

— Чым менш у краіне развіты турызм, тым вышэйшыя кошты. Напрыклад, ва Угандзе, каб пакатацца гадзіну па Ніле на чаўне, трэба выкласці паўтара мільёна рублёў. За такі ж кошт можна наведаць нацыянальны парк. А ў Намібіі турызм развіты добра, адпаведна, і цэны там больш лаяльныя: у парк трапіце за 750 тысяч рублёў, гадзіна на квадрацыклах выльецца прыкладна ў 350 тысяч рублёў. Месца ў кэмпінгу каштавала 150—300 тысяч з чалавека, за палатку даводзілася плаціць удвая больш.

— Ты збіралася жыць на пятнаццаць тысяч рублёў у дзень. Удалося ажыццявіць гэтую задуму?

— Прыкладна так яно і атрымалася. Хоць Намібія — краіна дарагая: гэта еўрапейская Афрыка, дзе няма простай і таннай ежы. Там мне ўдавалася пражыць на 45 тысяч рублёў за дзень. Не скажу, што жыла на шырокую ногу, але часам дазваляла сабе «шыкаваць». У іншых краінах мы за невялікія грошы набывалі ежу ў мясцовых жыхароў: напрыклад, вельмі папулярныя ва Угандзе і Кеніі смажаныя бананы альбо ўга́лі — кашу з кукурузнай мукі. Да экзотыкі не дабраліся, праўда, аднойчы нам прапанавалі смажаных вусеняў. Я люблю каштаваць новае, але не настолькі ж — на выгляд кузуркі былі не надта апетытныя *(смяецца)*.

— А які асноўны рацыён у мясцовых жыхароў?

— Папулярныя, напрыклад, мато́кі — пюрэ з вараных і смажаных бананаў. У Афрыцы растуць і несалодкія бананы, якія на смак нагадваюць бульбу. Яшчэ адна папулярная страва — гэта кукуруза. Вараць кукурузную муку на вадзе, пасля дадаюць гародніну ці мяса. Распаўсюджаны чапа́ці — праснакі з мукі. Усё гэта танна, сытна і даступна кожнаму.

Фота Таццяны ГЕНДЗЕЛЬ.

Афрыканцы куды больш добрыя, адкрытыя, прастадушныя, нават першабытныя, але пры гэтым — гуманныя.

Рытуальныя маскі, магічныя прадметы, лялькі вуду можна ўбачыць хіба што ў музеях ці ў сувенірных крамах.

— Як вырашылі жыллёвае пытанне?

— Мы ўзялі палатку — універсальнае жытло, якое можна ставіць паўсюль. Ва Угандзе, напрыклад, можна без праблем пераначаваць у паліцэйскім участку. Прыходзіш і кажаш, што ты турыст і вандруеш аўтастопам, маеш патрэбу паставіць палатку. Паліцэйскія выдзяляюць табе газончык.

У невялічкіх мястэчках альбо вёсках мясцовыя жыхары клічуць у госці: тут вас абавязкова запросяць на чай. У буйных гарадах добра працуе каўчсёрфінг (глабальная гасцявая сетка, удзельнікі якой запрашаюць да сябе ў госці праз інтэрнэт) — афрыканцы не так моцна разбэшчаны турыстамі, як еўрапейцы. Дастаткова напісаць тром-чатыром адрасатам, і нехта прапануе прытулак. Звычайна гаспадары адводзілі нам цэлы пакой з ложкам, душам, і заўжды кармілі.

— Раскажы пра аўтастоп у тых краінах...

— Мясцовыя даволі актыўна карыстаюцца гэтым відам перамяшчэння, бо грамадскага транспарту на ўсіх не хапае. Але ва Угандзе нас падбіралі таму, што хацелі зарабіць грошай. Ніхто не верыў, што мы ўвесь час вандруем такім чынам: калі кіроўцы чулі пра бясплатныя перавозкі, дык адкрыта смяяліся. Амаль усе яны сапраўды не разумелі, чаму мы хочам ехаць бясплатна, таму па некалькі разоў перапытвалі, колькі ім заплацім. Але мы былі экзатычнымі спадарожнікамі, і нас падвозілі ў абмен на гутарку. А яшчэ ў афрыканскім аўтастопе не існуе такога паняцця, як «няма месцаў» — прастора знойдзецца заўжды.

— Ад якіх стэрэатыпаў падчас вандроўкі ты пазбавілася?

— Я думала, што мы адрозніваемся толькі колерам скуры, аднак моцна памылялася. У афрыканцаў зусім іншы светапогляд і мысленне. Яны куды больш добрыя, адкрытыя, прастадушныя, я сказала б, нават першабытныя, але пры гэтым гуманныя, у іх моцна адчуваецца дух калектывізму. Афрыка вельмі кантрасная. Ты можаш прыехаць у племя, дзе ў людзей на галаве пер'е, а з адзення толькі набедравыя павязкі. А праз 200 кіламетраў убачыш у рэстаране афрыканцаў, апранутых у элітныя гарнітуры, пры гальштуках. Дарэчы, ва ўсіх краінах, дзе я была, праблем з вадой няма — яна даступная, хапае ўсім. Тое ж датычыцца і ежы.

«Прыходзіш і кажаш, што ты турыст і вандруеш аўтастопам, маеш патрэбу паставіць палатку. Паліцэйскія выдзяляюць табе газончык».

— Тры месцы, якія табе найбольш запомніліся?..

— Моцна ўражвае пустыня Наміб. Тое ж магу сказаць і пра другі па велічыні вадаспад у свеце — Вікторыю. Гара Кіліманджара пакінула кантрасныя ўспаміны — дзіўна бачыць снежныя вяршыні ў гарачай Афрыцы.

— Да якіх неспадзяванак трэба быць падрыхтаваным?

— Усё бачыш на месцы. Мы паўтаралі за мясцовымі — напрыклад, бралі ваду адтуль, адкуль яны. Я прагледзела законы, бо часам можна трапіць у непрыемнасці з-за дробязі. Напрыклад, на Мадагаскары ёсць закон: калі ты забіў матыля — сядзеш у турму. З Кеніі нельга вывозіць ракавіны вялікіх памераў.

— Чым самі афрыканцы ганарацца найперш?

— У цэлым яны патрыёты сваіх краін: многія носяць майкі з надпісамі кшталту «Я люблю Уганду», «фенечкі» з нацыянальным сцягам. На адзенні часта можна заўважыць контур краіны альбо малюнак кукурузы. Яны заўжды распытвалі пра наша стаўленне да Афрыкі і запрашалі прыехаць яшчэ раз.

Афрыканцы — веруючыя людзі, мусульмане альбо хрысціяне. Рытуальныя маскі, магічныя прадметы, лялькі вуду тут убачыш хіба што ў музеях ці сувенірных крамах.

— Куды збіраешся ў наступны раз?

— Хачу вярнуцца ў Афрыку, абавязкова наведацца ў Намібію, дзе шмат прыродных багацця́ў. А ва Уганду можна паехаць дзеля стасункаў з людзьмі — гэта вельмі вясёлая і жывая краіна. Ад Чорнага кантынента ў мяне засталіся толькі пазітыўныя ўражанні. Кожная вандроўка чамусьці вучыць. Маё афрыканскае падарожжа паказала, што свет маленькі, а цяжкасці мы прыдумваем сабе самі — насамрэч магчыма ўсё!

Кацярына РАДЗЮК.
radziuk@zviazda.by

У Афрыцы растуць і несалодкія бананы, якія на смак нагадваюць бульбу.

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

26 ноября 2015 г. проводит электронные торги №1441722355223 по продаже права заключения договора аренды земельных участков в г. Минске на электронной торговой площадке «МИНСК - НЕДВИЖИМОСТЬ» (minskestate.by)

Предмет электронных торгов: право заключения договора аренды земельного участка сроком на 5 лет.

№ предмета аукциона	Месторасположение земельного участка	Кадастровый номер земельного участка	Площадь, га	Целевое назначение земельного участка/ назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества	Начальная цена предмета аукциона (бел. руб.)	Сумма задатка (бел. руб.)	Расходы на подготовку документации для проведения аукциона (бел. руб.)	Отдельные условия, предусмотренные в решении Мингорисполкома об изъятии земельного участка для проведения аукциона и иные условия аукциона
1	2	3	4	5	6	7	8	9
1	г. Минск в районе ул. Брикета – МКАД (34 км)	500000000006007843	3,5480	для строительства объекта «Административно-деловой комплекс в районе ул. Брикета-МКАД (34 км)»/ земельный участок для размещения объектов административного назначения	11 413 121 016	1 712 000 000	103 984 777	Проектирование и строительство объекта осуществлять со следующими параметрами: общая площадь здания комплекса (подлежит уточнению проектом): 38 400 кв.м, в том числе паркинга – 12 000 кв.м, функциональное назначение объекта – административно-делового назначения, состав объекта – административно-деловой комплекс со встроенным паркингом. Возместить Минскому районному унитарному предприятию «Агрокомбинат Ждановичи» упущенную выгоду в размере 5 241,140 тыс. руб. Возместить в установленном порядке потери сельскохозяйственного производства, вызванные изъятием пахотных земель площадью 0,7476 га для использования их в целях, не связанных с ведением сельского хозяйства, в размере 455 701,09 тыс. руб. на счет по учету средств республиканского бюджета по месту постановки на учет плательщика с учетом нормативов, действующих на дату их фактического возмещения
2.	г. Минск, на пересечении МКАД – ул. Байкальская	500000000002008681	0,2500	для строительства объекта «Автоматизированная автозаправочная станция на пересечении МКАД – ул. Байкальская»	657 134 624	100 000 000	59 198 455	Проектирование и строительство объекта осуществлять со следующими параметрами: функциональное назначение объекта – коммунальный объект, состав объекта – автоматизированная станция (ААЗС) на одну ТРК

Продавец: Минский городской исполнительный комитет, пр-т Независимости, 8, 220030, г. Минск, сайт: minsk.gov.by.

Организатор электронных торгов и оператор электронной торговой площадки: УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, телефоны: (017) 226 16 72, 327 40 22, сайт: mgcn.by.

Порядок проведения электронных торгов: электронные торги проводятся в соответствии с **регламентом** информационной торговой системы ЭТП «МИНСК – НЕДВИЖИМОСТЬ» (далее – Регламент) с соблюдением требований Положения о порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, в том числе земельных участков, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 №608 (далее – Положение).

Для участия в электронных торгах необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на сайте ЭТП по электронному адресу **minskestate.by**, пройти аккредитацию на ЭТП, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП, а также оплатить оператору ЭТП компьютерные услуги согласно прейскуранту, размещенному на сайте ЭТП.

Задаток перечисляется на на расчетный счет № 3012104971019 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, 220035, г. Минск, просп. Машерова, д. 80, УНП 190398583, получатель – УП «Минский городской центр недвижимости» (задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению) не позже срока окончания приема документов на участие в электронных торгах.

Лицо, желающее принять участие в электронных торгах в отношении нескольких предметов электронных торгов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из этих предметов.

Дата и время начала проведения электронных торгов: 26 ноября 2015 года в 15.00 (по времени на сервере ЭТП «МИНСК – НЕДВИЖИМОСТЬ»).

Победитель электронных торгов либо претендент на покупку, выразивший согласие на приобретение земельного участка по начальной цене, увеличенной на 5%, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах электронных торгов либо признания торгов несостоявшимися, до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка обязан:

- внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения);
- возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;
- возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения;
- выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Минский горисполком на основании решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона и протокола о результатах аукциона либо протокола о признании аукциона несостоявшимся, заключает с победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона **договор аренды земельного участка сроком на 5 лет**.

Размер штрафа, уплачиваемого участником электронных торгов и (или) их победителем (претендентом на покупку) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет:

по земельному участку для строительства объекта «Административно-деловой комплекс в районе ул. Брикета – МКАД (34 км)» – 1 712 000 000 бел. руб.;

по земельному участку для строительства объекта «Автоматизированная АЗС на пересечении МКАД – ул. Байкальская» – 100 000 000 бел. руб.

Прием заявлений на участие в электронных торгах с прилагаемыми документами осуществляется по 20.11.2015 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 2, тел. (017) 226 16 72.

Извещение о проведении аукциона в отношении земельного участка в районе ул. Брикета – МКАД (34 км) ранее было опубликовано 24.08.2015 г. в газете «Звязда».

Детальная информация о порядке участия в электронных торгах размещена на сайте ЭТП «МИНСК – НЕДВИЖИМОСТЬ» **(minskestate.by)**

РУП «ЖИЛКОММУНТЕХНИКА» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ

Наименование продавца (балансодержателя)	Номер лота	Наименование объекта торгов, краткие характеристики	Местонахождение	Условия продажи	Начальная цена продажи, бел. руб. без учета НДС	Задаток, бел. руб.	Дата проведения аукционных торгов, время	Последний день подачи заявления для участия в торгах
УСП СПМК-35 ОАО «Пинсксовхозстрой»	1	Капитальное строение (инв. №130/С-42954) – административно-бытовой корпус, общ. пл. 1903,7 м², расположенное на земельном участке, пл. 0,4656 га с кадастровым номером 144500000006000041	Брестская обл., г. Пинск, ул. Козубовского, д. 31	Без условий	51 039 500	5 103 950	04.11.2015 г. в 11.00	03.11.2015 г. до 16.30
Организатор торгов		РУП «Жилкоммунтехника», филиал «Центр «Белтехинвентаризация» Брестское областное управление						
Срок заключения договора купли-продажи		В течение 20-и рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона						
Условия оплаты		В соответствии с заключенным договором купли-продажи						
Номер р/с для перечисления задатка		р/с 3012105618108 руб. РБ в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк» по г. Минску, код 153001369, УНП 102353509						

Место проведения аукционных торгов: г. Брест, ул. Наганова, 10-325, филиал «Центр «Белтехинвентаризация».

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00. Контактные телефоны организатора аукционных торгов: 8-(0162)-20-92-13, 21-88-81.

***Перечень документов, которые необходимо предоставить для участия в аукционных торгах, перечислен в объявлении, опубликованном в газете «Звязда» от 24.12.2014 года**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор торгов: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, 5, (0212) 42-61-62

Продавец: ОАО «КУПЦОВЪ», 211793, Витебская область, г. Глубокое, ул. Ленина, 1, (029) 509-02-27

Лот №1 Изолированное помещение с инв. №220/D-5037, по адресу Витебская обл., Глубокский р-н, г. Глубокое, ул. Ленина, д. 1, пом. 1, общей площадью 3 769,4 кв.м, наименование – производственный корпус № 1; Изолированное помещение с инв. №220/D-5039, по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, г. Глубокое, ул. Ленина, д. 1, пом. 3, общей площадью 263,1 кв. м., наименование – фабричный цех. **Начальная цена:** 2 830 000 000 бел. руб. без НДС. **Размер задатка:** 283 000 000 бел. руб. **Шаг аукциона –** 141 500 000 бел. руб.

Лот №2. Капитальное строение с инв. №220/С-26666, расположенное по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, г. Глубокое, ул. Кирова, 122, общей площадью 531,4 кв.м, наименование – склад-арочник. Имущество расположено на земельном участке с кадастровым №221550100001004903 площадью 0,3866 га. **Начальная цена:** 210 000 000 бел. руб. без НДС. **Размер задатка**: 21 000 000 бел. руб. **Шаг аукциона –** 10 500 000 бел. руб.

Лот №3. Ограждение железобетонное 26 панелей высотой 2,5 м. Местонахождение: Витебская обл., Глубокский р-н, г. Глубокое, ул. Кирова, д. 127. **Начальная цена:** 20 200 000 бел. руб. без НДС. **Размер задатка:** 2 020 000 бел. руб. **Шаг аукциона** – 1 010 000 бел. руб.

Лот №4. Капитальное строение с инв. №220/С-11460, расположенное по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, г. Глубокое, ул. Кирова, д. 127, общей площадью 58,3 кв.м, наименование – проходная-весовая. Капитальное строение с инв. №220/С-11455, расположенное по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, г. Глубокое, ул. Кирова, 127, общей площадью 1242,9 кв.м, наименование – капустохранилище. **Начальная цена:** 2 004 146 400 бел. руб. без НДС. **Размер задатка:** 200 414 000 бел. руб. **Шаг аукциона** – 100 208 000 бел. руб.

Лот №5. Капитальное строение с инв. №220/С-11452, расположенное по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, г. Глубокое, ул. Кирова, д. 124, общей площадью 1799,2 кв.м, наименование – овощехранилище (картофелехранилище). **Начальная цена:** 3 289 414 200 бел. руб. без НДС. **Размер задатка:** 328 941 000 бел. руб. **Шаг аукциона –** 164 471 000 бел. руб.

Лот №6. Капитальное строение с инв. №220/С-11453, расположенное по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, г. Глубокое, ул. Кирова, д. 131, общей площадью 2 322,6 кв.м, наименование – овощехранилище. **Начальная цена:** 1 924 271 000 бел. руб. без НДС. **Размер задатка:** 192 427 100 бел. руб. **Шаг аукциона –** 96 214 000 бел. руб.

Лот №7. Капитальное строение с инв. № 220/С-11459, расположенное по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, г. Глубокое, ул. Кирова, д. 127, общей площадью 14,4 кв.м, наименование – подстанция подсобного хозяйства. **Начальная цена:** 43 568 400 бел. руб. без НДС. **Размер задатка:** 4 356 000 бел. руб. **Шаг аукциона –** 2 179 000 бел. руб.

Лот №8. Грузовой фургон МАЗ 43704 3, цвет белый, рег. знак АВ 5951-2, 2008 г.в. **Начальная цена:** 134 300 000 бел. руб. без НДС. **Размер задатка:** 13 430 000 бел. руб. **Шаг аукциона –** 6 715 000 бел. руб.

Лот №9. Трактор МТЗ 80, рег. знак БЯ 0815, 1992 г. в. **Начальная цена:** 70 000 000 бел. руб. без НДС. **Размер задатка:** 7 000 000 бел. руб. **Шаг аукциона –** 3 500 000 бел. руб.

Лот №10. Грузовой фургон GAZ-3309, цвет белый, рег. знак АЕ 2323-2, 2010 г.в. **Начальная цена:** 96 200 000 бел. руб. без НДС. **Размер задатка:** 9 620 000 бел. руб. **Шаг аукциона –** 4 810 000 бел. руб.

Лот №11. Грузовой специальный самосвал SAZ-3507, цвет голубой, рег. знак АА 4577-2, 1988 г. в. **Начальная цена:** 24 400 000 бел. руб. без НДС. **Размер задатка:** 2 440 000 бел. руб. **Шаг аукциона** – 1 220 000 бел. руб.

Лот №12. Грузовой специальный самосвал SAZ-3507, цвет синий, рег. знак АВ 1360-2, 1991 г. в. **Начальная цена:** 42 100 000 бел. руб. без НДС. **Размер задатка:** 4 210 000 бел. руб. **Шаг аукциона** – 2 105 000 бел. руб.

Лот №13. Грузовой фургон GAZ-33021, цвет светло-серый, рег. знак АВ 6061-2, 1997 г. в. **Начальная цена:** 24 400 000 бел. руб. без НДС. **Размер задатка:** 2 440 000 бел. руб. **Шаг аукциона –** 1 220 000 бел. руб.

Лот №14. Грузовой бортовой UAZ-3303, цвет зеленый, рег. знак 1091ВТР, 1991 г. в. **Начальная цена:** 25 700 000 бел. руб. без НДС. **Размер задатка:** 2 570 000 бел. руб. **Шаг аукциона –** 1 285 000 бел. руб.

Лот №15. Автобус вагон PAZ 3205, цвет белый, рег. знак АВ 1518-2, 1993 г. в. **Начальная цена:** 56 800 000 бел. руб. без НДС. **Размер задатка:** 5 680 000 бел. руб. **Шаг аукциона –** 2 840 000 бел. руб.

Лот №16. Культиватор чизельный КЧ-5,1, инв. №42. **Начальная цена:** 62 500 000 бел. руб. без НДС. **Размер задатка:** 6 250 000 бел. руб. **Шаг аукциона –** 3 125 000 бел. руб.

Лот №17. Агрегат комбинированный широкозахватный АКШ-7,2, инв. №48. **Начальная цена:** 47 300 000 бел. руб. без НДС. **Размер задатка:** 4 730 000 бел. руб. **Шаг аукциона –** 2 365 000 бел. руб.

Лот №18. Сеялка зерновая Directa 400 Corsa, инв. №592. **Начальная цена:** 270 700 000 бел. руб. без НДС. **Размер задатка:** 27 070 000 бел. руб. **Шаг аукциона –** 13 535 000 бел. руб.

Лот №19. Культиватор чизельный КЧ-5,1, инв. №1711. **Начальная цена:** 62 500 000 бел. руб. без НДС. **Размер задатка:** 6 250 000 бел. руб. **Шаг аукциона –** 3 125 000 бел. руб.

Лот №20. Культиватор чизельный КЧ-5,1, инв. №6108. **Начальная цена:** 62 500 000 бел. руб. без НДС. **Размер задатка:** 6 250 000 бел. руб. **Шаг аукциона –** 3 125 000 бел. руб.

Лот №21. Сеялка механическая навесная СМН-12, инв. №7003. **Начальная цена:** 57 300 000 бел. руб. без НДС. **Размер задатка:** 5 730 000 бел. руб. **Шаг аукциона –** 2 865 000 бел. руб.

Лот №22. Культиватор-опрыскиватель универсальный КОУ-4/6, инв. №7700. **Начальная цена:** 28 900 000 бел. руб. без НДС. **Размер задатка:** 2 890 000 бел. руб. **Шаг аукциона –** 1 445 000 бел. руб.

Лот №23. Агрегат комбинированный посевной АКП-4, инв. №9042. **Начальная цена:** 60 500 000 бел. руб. без НДС. **Размер задатка:** 6 050 000 бел. руб. **Шаг аукциона –** 3 025 000 бел. руб.

Лот №24. Опрыскиватель прицепной штанговый «Мекосан 2500-18», инв. №9045. **Начальная цена:** 81 100 000 бел. руб. без НДС. **Размер задатка:** 8 110 000 бел. руб. **Шаг аукциона –** 4 055 000 бел. руб.

Лот №25. Транспортер подачи яблок из ямы инв. №102, Пресс ленточный инв. №1002, Емкость для ферментации 15,5 м.куб. инв. №1006, Пульт управления вакуум-выпарной инв. №1025, Фильтр-пресс для сока инв. №1029, Емкость для ферментации 15,5 м.куб. инв. №1066, Водоподготовительная система ВПСМ-5-16 инв. №3005, Вакуум-выпарная установка; Машина моечная для яблок Т1-КУМ-5, кол-во 2 шт. инв. №640. **Начальная цена:** 1 760 000 000 бел. руб. без НДС. **Размер задатка:** 176 000 000 бел. руб. **Шаг аукциона –** 88 000 000 бел. руб.

Лот №26. Машина моечная лопастная Т1-КУМ-3 инв. №414. **Начальная цена:** 47 100 000 бел. руб. без НДС. **Размер задатка:** 4 710 000 бел. руб. **Шаг аукциона** – 2 355 000 бел. руб.

Лот №27. Машина моечная лопастная Т1-КУМ-3 инв. №415. **Начальная цена:** 36 500 000 бел. руб. без НДС. **Размер задатка:** 3 650 000 бел. руб. **Шаг аукциона –** 1 825 000 бел. руб.

Лот №28. Резка, инв. №105; Сдвоенный транспортер пластинчатый, инв. №242; Сдвоенный транспортер пластинчатый, инв. №405; Транспортер, инв. №244; Моечная машина барабанная, инв. №633; Машина закаточная КЗК, инв. №754; Сдвоенная протирочная машина, инв. №904; Сдвоенная протирочная машина, инв. №9011; Овощерезка промышленная, инв. №1053; Резка овощей, инв. №1117; Элеватор «Гусиная шея», инв. №1129; Элеватор «Гусиная шея», инв. №1140; Каплеструйный принтер, инв. №1136; Этикетировочная машина для ж/б, инв. №1729; Этикетировочная машина, инв. №1743; Машина закаточная с маркиратором для ж/б, инв. №1745; Наполнитель горошка карусельный с вибратором, инв. №1746; Наполнитель заливы вакуумный карусельный, инв. №1750; Автоклавная корзина, инв. №1751; Командный пульт управления, инв. №1774; Элеватор «Гусиная шея», инв. №1906; Элеватор «Гусиная шея», инв. №1907; Транспортер, инв. №2005; Закаточная машина, инв. №2026; Смеситель для салатов. **Начальная цена:** 208 962 952 бел. руб. без НДС. **Размер задатка:** 10 896 000 бел. руб. **Шаг аукциона** – 10 449 000 бел. руб.

Лот №29. Емкость нержавеющая 3т, кол-во 5 шт., инв. № 29, 31, 33, 35, 39; Бак для воды (емкость нержавеющая с рубашкой обогрева), инв. №139; Емкость для хранения сока алюминиевая 16 м³, инв. №471; Емкость для сока стальная эмалированная 16 м³, кол-во 2 шт., инв. № 1026, 1027; Емкость для сока алюминиевая 20 м³, кол-во 2 шт., инв. № 1122, 1123; Емкость для сока стальная эмалированная 16 м³, кол-во 4 шт., инв. № 1634, 1635, 1636, 1637; Емкость для хранения сока алюминиевая 16 м³, инв. № 1638; Машина для мойки и шпарки пустых банок, инв. № 1724; Транспортерная система подачи жестебанок (6ед.), кол-во 2 шт., инв. № 1741, 1772; Депаллетайзер, инв. №749; Транспортерная система подачи жестебанок (6 ед.); Ополаскиватель и шпаритель банок, инв. №2107; Купажная емкость нержавеющая с мешалкой на тензодатчиках, инв. №3019; Мойка пустых банок с переворачивателем, инв. № 20227; Транспортер рольганг; Конвеер цепной 6 м; Ванна из нержавеющей стали 2500х1000; Щит электрический из нержавеющей стали. **Начальная цена:** 230 607 383 бел. руб. без НДС. **Размер задатка:** 23 060 000 бел. руб. **Шаг аукциона –** 11 531 000 бел. руб.

Торги состоятся **23.11.2015 г. в 14.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Заявления на участие в торгах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и подачи заявлений на участие в торгах: **с 22.10.2015 с 8.30 по 20.11.2015 г. до 17.30.** Задаток перечисляется на р/с 3012470630033 в РКЦ № 39 в г. Глубокое ф-ла ОАО «Белагропромбанк» – Витебское областное управление, код 424, УНП 300019596. Получатель платежа: ОАО «КУПЦОВЪ». Условие аукциона: оплата НДС в размере 20% от цены продажи имущества

Продавец: ОАО «Плисский льнозавод», Витебская обл., Глубокский р-н, г.п. Подсвилье, ул. Советская, 83, (029) 598-99-44

Лот №1. Специальное транспортное средство (прицеп бортовой тракторный) СТС-12, рег. знак БЯ 0917, 2008 г.в. **Начальная цена:** 96 120 000 бел. руб. с НДС. **Размер задатка:** 9 612 000 бел. руб. **Шаг аукциона –** 4 806 000 бел. руб.

Лот №2. Специальное транспортное средство (прицеп бортовой тракторный) СТС-12, рег. знак БЯ 0918, 2008 г.в. **Начальная цена:** 96 120 000 бел. руб. с НДС. **Размер задатка**: 9 612 000 бел. руб. **Шаг аукциона –** 4 806 000 бел. руб.

Лот №3. Трактор «Белорус» 82.1, рег. знак ВА 4155, 2005 г.в. **Начальная цена:** 72 000 000 бел. руб. с НДС. **Размер задатка:** 7 200 000 бел. руб. **Шаг аукциона –** 3 600 000 бел. руб.

Лот №4. Трактор «МТЗ 82.1», рег. знак ВА 2806, 2003 г.в. **Начальная цена:** 57 720 000 бел. руб. с НДС. **Размер задатка:** 5 772 000 бел. руб. **Шаг аукциона –** 2 886 000 бел. руб.

Лот №5. Трактор «Белорус 82.1», рег. знак ВА-2 4651, 2006 г.в. **Начальная цена:** 75 840 000 бел. руб. с НДС. **Размер задатка:** 7 584 000 бел. руб. **Шаг аукциона –** 3 792 000 бел. руб.

Лот №6. Трактор «Белорус 82.1», рег. знак ВА-2 5598, 2007 г.в. **Начальная цена:** 86 400 000 бел. руб. с НДС. **Размер задатка:** 8 640 000 бел. руб. **Шаг аукциона –** 4 320 000 бел. руб.

Лот №7. Трактор «Белорус 82.1», рег. знак ВА-2 4686, 2007 г.в. **Начальная цена:** 86 400 000 бел. руб. с НДС. **Размер задатка:** 8 640 000 бел. руб. **Шаг аукциона –** 4 320 000 бел. руб.

Лот №8. Трактор «МТЗ 82.1», рег. знак ВА 2817, 2003 г.в. **Начальная цена:** 61 320 000 бел. руб. с НДС. **Размер задатка:** 6 132 000 бел. руб. **Шаг аукциона –** 3 066 000 бел. руб.

Лот №9. Трактор «Белорус 82.1», рег. знак ВА-2 4685, 2007 г.в. **Начальная цена:** 86 400 000 бел. руб. с НДС. **Размер задатка:** 8 640 000 бел. руб. **Шаг аукциона –** 4 320 000 бел. руб.

Торги состоятся **24.11.2015 г. в 12.00** по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, г.п. Подсвилье, ул. Советская, 83 в ОАО «Плисский льнозавод». Заявления на участие в торгах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и подачи заявлений на участие в торгах: **с 22.10.2015 с 8.30 по 23.11.2015 г. до 17.30.** Задаток перечисляется на р/с №3012470594456 в РКЦ №39 филиала ОАО «Белагропромбанк» Витебское областное управление, код 424, УНП 300019491. Получатель платежа: ОАО «Плисский льнозавод». Место нахождения объектов: Витебская обл., Глубокский р-н, г.п. Подсвилье, ул. Советская, 83

Торги проводятся в соответствии с Законом Республики Беларусь от 13 июля 2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)». Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору торгов заявление на участие в торгах с приложением документов: заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении; для индивидуального предпринимателя – копии свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя; для юр. лица – доверенности, выданной представителю юр. лица (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о гос. регистрации юр. лица; для иностранного юр. лица, иностранной организации, не являющейся юр. лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юр.лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком; для представителя гражданина РБ, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенности, оформленной в соответствии с законодательством. При подаче документов на участие в торгах граждане РБ, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане РБ, постоянно проживающие за пределами РБ, представители юр. лиц РБ, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. Имущество считается проданным лицу, которое предложило на торгах самую высокую цену. В случае если торги признаны несостоявшимися, предмет торгов продается единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (либо явившемуся для участия в них) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 5 (пяти) дней со дня проведения торгов возместить затраты на организацию и проведение торгов, затраты по оценке имущества, изготовлению документации, необходимой для проведения торгов; в течение пяти рабочих дней со дня проведения торгов подписать договор купли-продажи; оплатить предмет торгов и НДС в размере 20% от цены продажи имущества в порядке и в сроки, установленные договором купли-продажи. Организатор торгов вправе отказаться от проведения торгов не позднее, чем за 5 дней до даты их проведения. Ознакомление с объектами осуществляется в рабочие дни с 8.30 до 17.00. **Контактный тел.: (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by**

Друкуецца ў «Маладосці»

Высокаарганізаваныя іншапланетныя формы жыцця не могуць нападаць без прычыны: у гэтым няма ніякай логікі! Нарэшце гэта заяўлена нашымі фантастамі — у супрацьвагу поглядам замежных мэтраў жанру. Паміж мыслячымі стварэннямі не можа быць бездані, гэта так. Але ж канфлікт цывілізацый заўсёды патрабуе ахвяр... Гэтая місія закончылася тым, што... Не, лепш не раскрываць вам раней часу тое, чым дакладна яна закончылася. Сяргей Белаяр кожнай старонкай трымае чытача ў напружанні і не дае забыцца, што на касмічнай станцыі «Ёган Кеплер»... шмат пылу.

Сяргей БЕЛАЯР

ВЫРАТАВАЛЬНАЯ МІСІЯ

УРЫВАК З АПОВЕСЦІ

Фатонны зоркалёт «Слейпнір» імкліва набліжаўся да канчатковага пункту маршруту — міжнароднай касмічнай станцыі «Ёган Кеплер».

— Як думаеш, чаму знікла сувязь са станцыяй? — спытаў Кінбут Бянткоўскі, гледзячы ў манітор, на якім, вылучаючыся на фоне вугальна-чорнай прасторы з сотнямі немігатлівых зорак, расла Asteroidea.

— Не ведаю, камандзір, — паціснуў плячыма Едка Гедройц, — прычын можа быць шмат, пачынаючы ад паломкі перадатчыка і заканчваючы сонечнай бурай. Чаго гадаць? Састыкуемся і ўсё высветлім!

Бянткоўскі кіўнуў. Зямля атрымала сігнал SOS тыдзень таму, пасля чаго экіпаж МКС на сувязь больш не выходзіў.

— Будзем спадзявацца, што нічога сур'ёзнага не адбылося.

— Гэта апошняе, у што б я паверыў. Рацыянальней зыходзіць з таго, што ў іх — праблемы! Прычым сур'ёзныя.

— Ты ператвараешся ў закаранелага цыніка, Едка!

— Космас робіць мяне такім. Пройдзе яшчэ не адна тысяча, калі не мільён гадоў, перш чым зоркі перастануць быць варожымі людзям. Заўсёды трэба настройвацца на горшае.

«Ёган Кеплер» паступова запаўняў сабой увесь экран.

— Бачных пашкоджанняў не адзначаю, — паведаміў Доўкгал Геліч, скарыстаўшыся трансфакатарам. — Зваротны бок разгледзець не магу!

— Як толькі скінем хуткасць да самай малой, высылай бот.

— Ёсць высылаць бот пасля тармажэння!

— Пераходжу на тармажэнне, — папярэдзіў таварышаў Скумін Разыцень. «Слейпнір» слаба скалануўся. Слупок акселераметра хутка папоўз уніз, паказваючы адмоўнае паскарэнне.

Праз некалькі хвілін, калі да станцыі заставалася пяцьсот кіламетраў, інжынер-радыст выпусціў бот, карэктуючы яго курс пры дапамозе джойсціка. Разведчык не баяўся ні паскарэння, ні рэзкага змянення курсу, ні звышвысокіх і звышнізкіх тэмператур, што дазваляла выкарыстоўваць яго ў шырокім дыяпазоне даследаванняў.

Астранаўты не адрывалі позіркаў ад маніторaў. Напружанне расло.

— Выява выразная! Адхіленні тэхнагеннага характару адсутнічаюць!.. Што за чорт?

— Што здарылася, Доўкгал?

— Я страціў кантроль над ботам! — Геліч рухаў джойсцікам, аднак нічога не мянялася: разведчык куляй нёсся да станцыі. Усачыць за сапраўдным вадаспадам даных не ўяўлялася магчымым.

Праз імгненне камера бота адключылася.

Інжынер-радыст вылаяўся і паспрабаваў аднавіць кантроль. Нічога не атрымалася — разведчык урэзаўся ў адну з сонечных батарэй. Яна выбухнула мільёнам аскепкаў і дробных абломкаў. Куляючыся, бот пачаў адыходзіць ад МКС.

— Што гэта было?

— Не ведаю, капітан! Бот быў спраўны — я двойчы пратэсціраваў усе сістэмы... — У голасе інжынера-радыста гучалі ноткі разгубленасці. — Сувязь нібы абсеклі...

Бянткоўскі і Гедройц пераглянуліся. На твары работніка службы бяспекі з'явіўся выраз «я ж казаў!».

— Адмовіла і асноўная, і дублюючая сістэмы. У маёй практыцы такое ўпершыню!.. Паспрабуем другі бот?

Бянткоўскі думаў нядоўга:

— Толькі асцярожна!

— Ёсць асцярожна! — Словы Геліча не разышліся са справай: ён акуратна падвёў бот да меркаванай мяжы мёртвай зоны, гатовы ў любы момант вярнуць разведчыка. Апаратура нічога не рэгістравала. Нервова аблізаўшы вусны, інжынер-радыст плаўна штурхнуў джойсцік.

Бот перасёк нябачную рысу і працягваў рух. Геліч падвёў разведчыка ўшчыльную да «Ёгана Кеплера», што дазволіла разгледзець паверхню МКС у дробных дэталях, пасля чаго накіраваў на іншы бок.

— Герметычнасць корпуса не парушаная!.. Ніякіх слядоў экстраннай эвакуацыі!

— Паспрабуй звязацца з імі!

— Ёсць!.. Выратавальнае судна «Слейпнір» выклікае міжнародную касмічную станцыю «Ёган Кеплер»!.. «Ёган Кеплер», адкажыце «Слейпніру»!.. — Інжынер-радыст перабраў шэраг частот, але на кожнай з іх адказам быў толькі белы шум.

— Доўкгал, вяртай бот!.. Экіпажу падрыхтавацца да стыкоўкі!.. — Астранаўты заварушыліся ў крэслах, правяраючы прывязныя рамяні і ўладкоўваючыся ямчэй. Пераканаўшыся ў тым, што ўсе гатовыя, капітан загадаў: — Скумін, пачынай!

Працэдура заняла каля паўгадзіны — «Слейпнір» аблізіўся са станцыяй і выпусціў злучальныя аўтаматычныя фермы, увянчаныя магутнымі магнітнымі прысоскамі. Дакрануўшыся да спецыяльных прыёмных пляцовак, яны намёртва зафіксавалі зоркалёт. Для ўзлёту патрабавалася адключыць электрычны ток, які сілкаваў магніты.

— Едка, бяры Геліча, Валовіча і Хурду!

— Зразумеў, камандзір!.. За мной!

Астранаўты апранулі скафандры, праверылі сістэму жыццезабеспячэння, рыштунак і зброю. На адмысловую самаходную каляску было загружана ўсё неабходнае для правядзення выратавальнай аперацыі.

— З Богам! — сказаў Бянткоўскі і праводзіў падначаленых вачыма да таго моманту, пакуль за групай не зачыніліся створкі шлюзавой камеры, затым зноў вярнуўся да экрана.

— Камандзір, як сувязь?

— Чую і бачу цябе добра, Едка!

— Уваходзім!

***

У корпусе прыйшлося выразаць дзірку — дзверы аказаліся заблакіраванымі. Прычым механічна — у крэмальерны замок быў устаўлены лом. Астранаўты ўключылі ліхтары на вінтоўках — святло не гарэла. Прамяні заскакалі па падлозе, сценах і столі.

— Яны нібы спрабавалі ад чагосьці абараніцца! — Гедройц, пакруціўшы ў руках лом, адкінуў яго, падняўшы воблака пылу, які на здзіўленне хутка асядаў.

— Дзіўна! Прайшоў усяго тыдзень, а пылу столькі, як пасля некалькіх тысяч гадоў запусцення...

Калі ўжо варта варажыць на будучыню, як некалі, па радочках кніг, то лепш за ўсё, калі гэта будуць кнігі брэсцкай пісьменніцы Кацярыны Мядзведзевай, у якой ледзь не кожная старонка змяшчае запавет, назіранне, параду, падказку або падбадзёрванне. Яе казкі — гэта, вядома ж, казкі. Але прыдатныя для чытання дарослымі. Вельмі-вельмі прыдатныя.
Тут прапануецца толькі пачатак аповесці, інтрыга якой — інтрыга «наадварот» — у тым, што гераіня да апошняй старонкі не ведае таго, пра што чытач здагадаўся, прачытаўшы загаловак.

Кацярына МЯДЗВЕДЗЕВА

ЧАРАЎНІК ДЛЯ ДЭЙСІ МЭЙ

УРЫВАК З АПОВЕСЦІ

Калі ў маіх сясцёр у дзяцінстве пыталіся, што яны любяць, Эма адказвала, што любіць маму і тату, Аліса згадвала слівавы ўзвар і прафітролі з персікавым джэмам, а я заўсёды маўчала. Таму што я люблю быць. Проста быць. Быць дома. Ці быць у садзе. Быць ля вады. Глядзець на дрэвы і траву, адчуваць скурай, як пячэ сонца ці мароз. Слухаць, як стукаціць паціху дожджык. Вязаць. Чытаць. Думаць што-небудзь прыемнае. Марыць. Калі няма ні сябровак, ні жаніха, застаецца шмат часу на мары.

— Дэйсі, ты зноў сядзіш дома, — бурчыць бабуля. — Чаму не пайшла з сёстрамі на танцы? Чакаеш, што ў кавалераў прарэжацца трэцяе вока і яны ўбачаць цябе скрозь сцены?

Бабуля старамодная. Маладых людзей заве «кавалеры» і дзівіцца, што Эма ды Аліса не бяруць з сабой нататнічак і аловак, каб запісваць, каму абяцалі кадрылю. А цяпер жа ўсё прасцей. Дзяўчыны пакорліва стаяць і чакаюць, хто іх запросіць. І іх запрашаюць. Амаль усіх. Акрамя мяне. Я ж невідзімка. Не, скрозь мяне не прасвечваюць шпалеры: наадварот, гэта я зліваюся з імі. Ведаеце выраз «wall flower» — «насценная кветачка»? Так завуць дзяўчын на балі, незаўважных настолькі, што ўвесь вечар яны праводзяць ля сценкі. Прастаяўшы так раз і другі, я палічыла за лепшае заставацца дома — там хаця б можна прысесці.

Мае улюбёныя колеры — лавандавы і экру. Але ў цёткі Аўгусты свая тэорыя. «Яркай знешнасці — спакойныя ўборы, — кажа яна, — сціплай знешнасці — эфектную абгортку». У перакладзе на чалавечую мову гэта азначае, што страхоццю накшталт мяне варта апранацца ярка, каб мінакі яшчэ здалёк, за тры кварталы маглі заўважыць гэткую агіднасць і своечасова звярнуць з дарогі. Кожны раз, калі мы адпраўляемся ў краму гатовай вопраткі ці па тканіны, цётка купляе бледна-ружовае Алісе, палевае Эме, а мне дастаюцца фуксія ці аранж. Пэўна, цётка крыўдзіцца, што я не нашу ўсе гэтыя рэчы. Нічога, калі-небудзь яны зноў увойдуць у моду, і мае траюрадныя пляменніцы вельмі ім узрадуюцца. «Наша бабуля Дэйсі ў маладосці была заўзятай модніцай», — падумаюць яны, і я не стану іх пераконваць у адваротным.

Наогул цётку Аўгусту варта было б звать мамай, але я не магу: я была ўжо занадта дарослая, калі бацька прывёў яе ў дом. Мне было пяць гадоў, калі я раскідвала пялёсткі руж на іх вяселлі. Не падумайце, мяне ніхто не крыўдзіць і падчаркай не называе: у цёткі Аўгусты цудоўны характар, і мае малодшыя сёстры таксама лёгкага нораву, дружалюбныя і гаваркія, вось-вось выпырхнуць замуж. Яны пайшлі ў маці — цёмнавалосыя, смуглыя, высокія. А я — бледная, рудаватая, праставатая. Адразу відаць, што я іншай пароды.

— З цыбуліны не вырасце ружа, — кажа пра мяне бабуля. А ўжо ў ружах бабуля разбіраецца, яна заўзятая садоўніца і агародніца. Наша бручка нават перамагла аднойчы на сельскагаспадарчай выставе акругі. Я не крыўджуся на бабуліны словы: якая там з мяне ружа! Калі казаць шчыра, такіх, як я, бяруць за лядашчую шыйку і выдзіраюць прэч з градкі, каб не псавалі выгляд.

— Мне шкада Дэйсі, цяжка будзе знайсці ёй мужа, — сказала неяк цётка Аўгуста, папіваючы з сяброўкай пасляабедзенную гарбату ў садовай альтанцы.

— Так, не пазайздросціш небарацы, з-за гэтага рабаціння яна падобная тварам да аржанога блінчыка. Здобнага румянага блінчыка, — адказала чуллівая сяброўка.

Яны не ведалі, што «блінчык» палівае кветкі непадалёк і ўсё чуе. Здаецца, у той дзень я ўпершыню расплакалася з-за сваёй знешнасці. Раней я разважала проста: калі маме, на якую я, пэўна, падобная, пашчасціла знайсці сабе мужа, майго добрага і прыстойнага бацьку, то і я змагу сустрэць добрага чалавека, калі прыйдзе час. Але пасля той падслуханай гутаркі мая вера пацьмянела. Аказваецца, я непрыгожая. Калі мяне і заўважаюць, то я здольная абудзіць толькі жаль. Я стала радзей глядзець у люстэрка і часцей задумвацца. Цяпер, калі мне мінула трыццаць, я не задумваюся наогул. Проста жыву, ды і ўсё. Аржаны блінчык ці цыбуліна — ну дык што, не ўсім жа быць ружамі. Роля ўсеагульнай цётачкі-векавухі не такая ўжо і дрэнная. Буду вязаць шкарпэткі пляменнікам і збіраць іх усіх на Каляды ў сваім вялікім і пустым доме. А можа, гэты дом застанецца Алісе ці Эме, калі іх жаніхі акажуцца недастаткова багатымі, і тады я стану нахлебніцай на старасці гадоў. «Слівавы пудынг сёння атрымаўся выдатны», — скажу я за абедам, і ўсё здзіўлена павернуцца ў мой бок: «Ой, а хто гэта тут?».

Не думайце, я не жалюся на жыццё. Я з радасцю сустракаю кожны новы дзень, а калі і злоўжываю часам разважаннямі, то выключна праз шкоднасць і начытанасць, а не ад журбы. Ад журбы, на шчасце, ніхто ў нашай сям'і не пакутуе. Ды і навошта пакутаваць, калі ва ўсіх ёсць справы куды цікавейшыя. Я абвязваю і абшываю ўсю сям'ю, бабуля садоўнічае, цётка Аўгуста кухарыць, і Эма ёй дапамагае, а самая наша малюпаценькая, Аліса, занятая больш за ўсіх: цэлымі днямі, з раніцы да позняй ночы, яна шукае сябе ў мастацтве. То пляце кошыкі з лазы, то піша санеты, то лепіць збаны, а апошнім часам сур'ёзна захапілася маляваннем на шоўку. Сям'я назірае за яе творчымі пошукамі замілавана і паблажліва. Так звычайна дарослыя глядзяць на малое, якое лепіць бабкі з пяску: маўляў, няхай сабе цешыцца дзіцятка.

Я лічу, кожная сям'я можа сабе дазволіць мець на ўтрыманні адну творчую асобу. Двое, трое — гэта ўжо перабор, а адна — у самы раз. Тым больш што ўсе займальныя справы — мыць, шыць, гатаваць ежу, выціраць пыл — мы разабралі сабе. Што ж заставалася рабіць небарацы Алісе, як не ўехаць па вушы ў мастацтва? Яна ўсё яшчэ не знайшла ў ім сябе, але і мастацтва яшчэ далёка не скончылася, таму ў хуткай будучыні, падазраю, нас чакаюць гукі флейты ці грук разца па камені, а можа быць, балет. Вядома, усё можа павярнуцца значна лепш, калі Аліса такі прыме прапанову каго-небудзь са сваіх шматлікіх паклоннікаў і выйдзе замуж. Цётка Аўгуста спадзяецца на гэта ўсёй душой. Калі ў Алісы быў перыяд захаплення опернымі спевамі, цётка ледзь утрымалася ад звароту да паслуг свацці. Але, на шчасце, Аліса хутка пераключылася на складанне філасофскага трактата пра сутнасць быцця, а гэты занятак, як вядома, патрабуе цішыні.

Бацька... Ледзь не забылася расказаць пра яго. Бацька таксама жыве з намі, але лічыць за лепшае рабіць выгляд, што яго тут няма. Адзіны мужчына ў доме, поўным жанчынамі, ён бліскуча выконвае свае мужчынскія абавязкі: чытае газету за сняданкам, курыць люльку на верандзе пасля вячэры, разразае гусака за святочным сталом. Яго цёплае паліто вывешваюць улетку на сонейка праветрыцца, яго шкарпэткі цыруюць з асаблівым стараннем, яго клапатліва ўкрываюць пледам, калі ён кладзецца адпачыць пасля абеду. Не ўпэўнена, што цётка чуе ад яго што-небудзь, акрамя «добрай раніцы», «дзякуй» і «дабранач», але гэта іх асабістая справа. Ды і не тое каб цётка Аўгуста нудзілася па гутарках, маючы ў наяўнасці бойкую на язык свякруху, дзвюх вельмі гаманкіх дочак і адну маўклівую, але ўсё ж здатную да маўлення падчарку. Часам жа прыемна і памаўчаць.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
22 10 2015 г.

SEX=БАЛЯСЫ

ПАЛЬЦАМ У НЕБА

...Вы калі-небудзь рабілі капітальны рамонт у кватэры, хадзілі разам са сваёй палавінкай на будаўнічы рынак з гэтай нагоды? Тады без праблем адкажаце на наступнае пытанне. Што перш за ўсё ідзе на ім выбіраць жанчына? Правільна, шпалеры! І нічога, што ў цябе за спінай голая каробка, якая патрабуе для пачатку дзясяткаў мяхоў шпатлёўкі, клею, цэменту і пяску, штраблення сцен і да тых шпалераў яшчэ — як ад Зямлі да Марса! Так-так, я разумею, што, «каб мары збываліся, побач проста трэба мець каханага чараўніка, а не балбатлівага казачніка». Але, ведаеце, на жаль ці на шчасце, будаўнічыя тэхналогіі яшчэ ніхто не адмяняў. Выходзіць, пальцам у неба?



Фота Сяргей НІКАНОВІЧА.

Як чарговы раз зрабіла колішняя балерына Настасся Валачкова. Не чулі? Ужо не раз пісалася пра тое, што паўсюдна, дзе б яна ні знаходзілася, каронным нумарам неператаўзыдзенага майстра эпатажу з'яўляецца фірменная расцяжка. Вось і на гэты раз Валачкова ўскінула нагу ўгору ў... рэстаране. Але не ўлічыла вышыню столі і «тыцнула» пальчыкам у люстру, зробленую з келіхаў. Як пішуць, рэстаран тут жа перакваліфікаваў гэты святільнік у звычайны посуд, маўляў, апошні б'ецца на шчасце, і дараваў выхадку колішняй прыме. (Ага, нагадала анекдот. «У Разанскай вобласці шыкоўны «Майбах» урэзаўся ў дрэва. Разанская вобласць ціхенька знікла з месца дарожна-транспартнага здарэння»).

Ці вось яшчэ прыклад. Адно з дацкіх турагенцтваў выкарыстала катастрафічную дэмаграфічную сітуацыю ў краіне як нагоду для цыкла рэкламных ролікаў. У першым — «Зрабі гэта для Данії!» — моладзь заклікаюць адпраўляцца ў рамантычныя падарожжы: па статыстыцы, дзесяць працэнтаў жыхароў краіны былі «зроблены» за яе межамі. У другім — «Зрабі гэта для мамы!» — аўтары пайшлі яшчэ далей, заклікаючы пенсіянерак адпраўляць сваіх дарослых дзяцей на адпачынак у цёплыя краіны і чакаць з'яўлення на свет унукаў. Тут статыстыка сцвярджае, што менавіта ў такіх умовах колькасць разоў «таго самага» ў датчан павялічваецца ажно на 51 працэнт. Аўтары не абмежаваліся рэкламнай акцыяй і знялі серыю ролікаў з практыкаваннямі, якія павышаюць якасць сексу і яго колькасць. Абавязковая ўмова — выконваць іх разам з партнёрам. Што сказаць на тое? Акцыя быццам бы неблагая, толькі... Анекдот ведаеце? «Лыжачка за маму... Лыжачка за тату... Лыжачка за бабулю... Лыжачка за дзядулю... Малы еў манку і пачынаў пакрысе ненавідзець усіх сваіх родных...»

...А трэба ўсяго толькі паказаць пальцам у неба і сказаць: «А хочаш, я падару табе зорку?!»

Ды холіць замежных прыкладаў, у нас і сваіх хапае. Вось убачыў у метро рэкламу аднаго прадпрыемства па вытворчасці мяккай мэблі. Са спальным гарнітурам пад назвай «Вікторыя» я яшчэ магу пагадзіцца, бо даваць ім жаночыя імёны — даўняя традыцыя (як і прысвойваць іх ураганам. «Тата, чаму ўраганы называюць жаночымі імёнамі?» — «Падрасцеш, сынок, зразумееш!»). А вось як вам крэсла-ложак пад назвай «Яўген»? Як па мне, дык феерычна! Якраз для нашай рубрыкі. Ну, калі гэты прадмет мэблі купіць дзяўчына, усё яшчэ нічога сабе, нават забаўна. «Што на выхадныя рабіла?» — «Ды два дні запар з «Яўгенам» не магла развітацца, так і праляжалі разам пад коўдрачкай!» (Праўда, трэба памятаць наступнае. «З палюбоўнікам дрэнна толькі ў адным — на яго маці не паскардзішся»). А калі крэсла-ложак з такой назвай набудзе халасцяк? Тэлефануеш, напрыклад, сябру, пытаешся, чым той займаецца. А ён у адказ, маўляў, ад «Яўгена» ніяк адарвацца не магу... Так што, мяркую, над назвай больш удумліва папрацаваць трэба, каб пазбегнуць казусаў.

Але яшчэ больш здзівіла інфармацыя з таго ж разраду — «пальцам у неба» — пра адзін рэсурс у сеціве, на якім маладыя беларусы шукаюць адно аднаго. Не, не таму, што яны згубіліся, а таму, што і... не сустракаліся. Дакладней, сустрэліся, але не пазнаёміліся. Проста не рызыкнулі падысці, павітацца, сказаць нешта смешнае, назваць сваё імя і спытаць імя візаві. Дзіўна, але гэта так: маладое пакаленне развучылася знаёміцца на вуліцы, у транспарце, у кавярнях. Эх, а як некалі проста было прыручыць дзяўчыну! «Бачыш прыгожую. Падыходзіш. Корміш абяцаннямі. Пагладжваеш яе. Харошая дзяўчына. Харошая. Усё, гэта твая дзяўчына!» Але, што яшчэ больш дзіўна, дык гэта тое, як хлопцы і дзяўчаты шукаюць сваіх выпадковых «каханых». Не рызыкнуўшы сказаць некалькі слоў, гледзячы адно аднаму ў вочы, яны, тым не менш, дасканала фіксуюць усе дэталі «сустрэчы»: хто ў што быў апрануты, які ў прадмета цікавасці колер вачэй, з кім ён быў, на якім маршруце адбылося «рандэву», у колькі па часе. Некаторыя нават умудраюцца ўпотай сфатаграфаваць чалавека! А потым уся гэтая інфармацыя выкладваецца ў сеціве («Даказана, што з камбінацыі ляноты і логікі атрымліваюцца праграмісты») са слёзным заклікам: людзі, дапамажыце знайсці хлопца/дзяўчыну! Магчыма, гэта лёс, маё каханне! Што цікава, у віртуальнай прасторы і словы прыемныя знаходзяцца, і кампліменты патэнцыяльнаму абранніку («Алена вельмі доўга не хацела тлумачыць свайму хлопцу, чаму яна на яго пакрыўдзілася, а калі нарэшце адважылася на гэта, дык высветлілася, што Віця ўжо пяць гадоў таму яе кінуў і шчаслива жыве з іншай»).

...А трэба ўсяго толькі паказаць пальцам у неба і сказаць: «А хочаш, я падару табе зорку?!»

Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.

«У мяне верылі — і ўсё атрымалася»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— А як складваюцца вашы ўзаемаадносіны з братам, улічваючы, што вы працуеце ў адной сферы?

— Па рабоце мы не павучаем адзін аднаго, але параіцца можам. У кожнага з нас свая аўдыторыя, і калі я разглядаю сваю дзейнасць з пазіцыі камерцыі, то Андрэй мысліць найперш катэгорыямі творчасці. А што тычыцца нашых сямейных узаемаадносін, там мы заўсёды падтрымліваем адзін аднаго. Варта здарыцца якой непрыемнасці, мы тут жа кінемся на выратаванне. Спрэчкі здараюцца, але ў каго іх не бывае?

«Незвычайнае пачуццё, калі разумееш, што ўдзельнічаеш у каманднай працы і маеш дачыненне да стварэння нацыянальнага праекту».

— У чым брат стаў для вас прыкладам па жыцці?

— Ён стаў для мяне тым, на каго хацелася раўняцца ва ўсім, што датычыцца сцэны. Андрэй мэтанакіравана ішоў да таго, каб сабраць вакол сябе людзей, якім падабаецца тое, чым ён займаецца. Я бачыў чалавека, які быў душой кампаніі. І, назіраючы за гэтым, сам зразумеў, што хачу таксама быць на сцэне. А потым ужо вучыўся, слухаючы замежных выканаўцаў. Дапамог і вопыт працы за мяжой.

— Цяжка было адважыцца на ад'езд у Бахрэйн, дзе чакала жыццё сярод чужой культуры?

— Пераезд у іншую краіну ў 1996 годзе для мяне быў вымушаным крокам, бо большасць артыстаў тады не мела магчымасці зарабляць на радзіме. Я думаў, што трэба жыць, развівацца і дапамагаць бацькам, бо бачыў, наколькі ім было цяжка ездзіць у Польшчу «чаўнакамі». І ў той перыяд я пазнаёміўся з агентам, які прапанаваў «замуціць» бізнес. Ён прадстаўляў нашы інтарэсы ў Бахрэйне... Я паехаў у чужую краіну без ведання мовы, таму першы час мы маўчалі, як рыбы, і нічога не разумелі. Пачалі вучыцца, і ўжо праз некалькі тыдняў я больш-менш мог падтрымаць размову, а праз паўтара года свабодна гаварыў па-англійску. Некаторыя моманты ў культурным жыцці сапраўды нялёгка было прыняць. Але з часам разумееш, што ты жывеш у чужой краіне — значыць, павінен паважаць яе традыцыі і звычаі. А потым з'явіліся новыя кантакты, і ўсё ўспрымалася значна прасцей.

Аляксей з жонкай і дачушкай.

— У сілу якіх прычын вы вырашылі вярнуцца дадому?

— Час ад часу мы з жонкай прыязджалі ў Беларусь. Пераафармлялі дакументы і зноў вярталіся назад. А 2003 год стаў пераломным для Бахрэйна — умовы працы і заробкі сталі непрывабнымі. Вырашылі наведацца дадому. Прыязджаем, і ў той жа дзень мне тэлефануе кампазітар Уладзімір Сарокін і просіць выступіць дуэтам з маім братам на яго творчым вечары. На тым канцэрце нібыта адбылося маё вяртанне на сцэну. Там жа я сустрэў Аляксандра Ціхановіча, які прапанаваў мне зняцца ў тэлепраекце «Хіт-момант» (яго тады толькі планавалі запусціць). Мы з Ленай пачалі хуценька шукаць кампазітараў, аранжыроўшчыкаў і запісваць песні. Пра ад'езд з Беларусі нават думаць перасталі. У снежні 2003 года выйшаў мой першы альбом «Адкажы мне, чаму», і, калі яго раскупілі з неверагоднай хуткасцю, я зразумеў, што мая краіна зноў прыняла мяне...

Што за сустрэча на сцэне без песні? (З Дзянісам Майданавым.)

— Сёння вы — вядомы артыст і разам з тым шчаслівы муж і бацька траіх дзяцей. Што ў прыярытэце: праца ці бацькоўства?

— На жаль, я не адчуваю радасці бацькоўства ў поўным аб'ёме, бо вельмі заняты на працы. Калі ёсць магчымасць, то імкнуся максімальна праводзіць час з сям'ёй. Разумею, што дзеці сумуюць па мне. Малодшая дачка (жонка расказвала) ноччу прыходзіць да майго ложка і пытае, дзе тата? І гэта не можа не кранаць... Таму ў паездках я тэлефаную дадому па «Скайпе», дасылаю ім відэа. Мне сорамна, што не магу даваць дзецям столькі ўвагі, колькі павінен. Але спадзяюся, калі яны вырастуць, то змогуць дараваць мне.

«Прыязджаем, і ў той жа дзень мне тэлефануе кампазітар Уладзімір Сарокін і просіць выступіць дуэтам з маім братам на яго творчым вечары. На тым канцэрце нібыта адбылося маё вяртанне на сцэну».

— Неяк вы сказалі, што сямейнае жыццё — гэта кампраміс...

— На саступкі з ахвотай ідзеш у першыя гады адносін, калі толькі прыціраецеся адзін да аднаго і баіцеся страціць свайго чалавека. Ты разумееш, што калі не будзе ўзаемапаразумення, то нічога не атрымаецца. Цяпер мы ведаем, што ёсць дзеці, праца, і вельмі важна падтрымліваць другую палавінку, асабліва калі жыццё з усіх бакоў «падціскае». З самага пачатку Лена верыла ў мяне і ў тое, што я змагу быць паспяховым, — таму ўсё атрымалася. Мне, магчыма, пашчасціла, бо прафесійная дзейнасць вымушае не быць дома пастаянна. А значыць, паспяваем і адпачыць адно ад аднаго, і з нецярплівасцю чакаем сустрэчы.

Алена ДРАПКО. *drapko@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.654.
Нумар падпісаны ў 19.30 21.10.2015 г.

■ Разважанні пра сучаснасць

«Гадуюцца новыя класікі»

Літаратурны працэс не спыняецца ніколі. Новыя думкі ў галовах людзей запальваюць паэты. Пісьменнікі, занатоўваючы тое, што адбываецца ў рэчаіснасці, паспяваюць сказаць пра галоўнае. Слова «літаратара» лечыць, абуджае, заклікае. Яно натхняе рухацца наперад і падказвае, на што арыентавацца. Лепш зразумець душу творцаў можна, завітаўшы туды, дзе яны жылі. Так я і зрабіла, адкрыўшы для сябе культавае месца ў беларускай сталіцы — літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа. Аказваецца, там знаходзіцца той самы дом, у якім калісьці жыў класік. Пра тое, як адчуваў тут сябе Колас, пра што марыў і што яму балела, мне расказала дырэктар музея Зінаіда КАМАРОЎСКАЯ. А таксама, з вышыні свайго прафесійнага вопыту, яна ацаніла працэсы, якія адбываюцца ў сучаснай літаратуры.

Ля тых самых дзвярэй, праз якія калісьці хадзіў паэт.

— Экспазіцыі, прысвечаныя выдатным асобам, лічацца тым больш каштоўнымі, чым больш аўтэнтычных рэчаў у іх захавалася. Ці можа музей Якуба Коласа паказаць наведвальнікам тыя самыя прадметы, якімі карыстаўся наш класік?

— Больш як паўстагоддзя няма з намі народнага паэта, але Дом Коласа жыве, падтрымліваючы традыцыі гаспадара, дзе ўсё захоўваецца са скрупулёзнай дакладнасцю. Наш музей з'яўляецца мемарыяльным, і ў гэтым яго асаблівасць. Дом Песняра, які мінчане і госці сталіцы ведаюць сёння як музей Якуба Коласа, быў пабудаваны ў 1952 годзе да 70-годдзя Якуба Коласа па праекце Георгія Заборскага, набыта мэбля, прадметы побыту, якія можна ўбачыць і сёння. Але сэрцам музея з'яўляецца кабінет, ці, як называў яго Якуб Колас, «маленькі, даволі цёмны заканурак, але цёплы і ў некаторай ступені нават утульны». Ён захаваўся абсалютна некранутым — такім, якім быў пры пісьменніку, — нават рэчы на стале ляжаць у тым самым парадку.

Кожны, хто завітае ў наш музей, праходзіць праз тыя самыя дзверы, праз якія ўваходзіў Пясняр, распранаецца, вешае сваё адзенне на тыя самыя кручкі, на якіх калісьці віселі паліто і капялюш Коласа, аглядае сябе ў тым самым люстэрку, у якое ён глядзеўся.

— Аднак ваш музей вядомы таксама і інтэрактыўнымі навінкамі, якія прывабліваюць мноства гасцей.

— Так, з аднаго боку, мы імкнёмся захаваць усё тое, што было пры Коласе, але, з другога боку, у XXI стагоддзі без некаторых тэхнічных сродкаў не абысціся. У адной з экспазіцыйных залаў устаноўлена віртуальная кніга пад назвай «Паэтычная каласіяна». Гартаючы яе, як звычайную кнігу, можна пазнаёміцца з прыжыццёвымі выданнямі кніг Якуба Коласа, ілюстрацыямі да іх, рукапісамі Песняра, урыўкамі з фільмаў і тэатральных пастановак па творах пісьменніка. Працуе інтэрактыўна-мультымедыйны комплекс «Чалавек. Эпоха. Час», дзе змешчаны багатыя фондавыя калекцыі, радаводнае дрэва Якуба Коласа, інфармацыя пра гісторыю музея. Кожны, хто наведае Дом Коласа, зможа паўдзельнічаць у стварэнні ўнікальнай паштоўкі з уласным фотаздымкам, праверыць сваю эрудыцыю ў віктарыне «Таямніцы Дома Песняра». Добрым напамінам аб наведанні музея стане кампакт-дыск з вершам ці ўрыўкам з паэмы, што гучаць у выкананні канкрэтнага музейнага наведвальніка. Яшчэ адна адметнасць — гукавая інсталяцыя ў гасцёўні і кабінеце Коласа. У кабінеце мы нібы вяртаемся ў апошні дзень пісьменніка. 13 жніўня 1956 года Колас пайшоў у ЦК з лістом, у якім напісаў пра стан літаратуры і культуры (ліст гэты актуальны і сёння): яго турбавала тое, што мала гавораць па-беларуску, што чысціня беларускай мовы не захаваная ні ў тэатры, ні на радыё, ні на тэлебачанні... На жаль, у ЦК ён не змог трапіць да таго, каго меркаваў. І нашы наведвальнікі чуюць, як скрыпіць лесвіца і даносяцца цяжкія крокі хворага, стомленага чалавека, як рыпяць дзверы на другім паверсе, а з радыёпрыёмніка ў кабінеце транслююцца беларускія навіны на рускай мове... Паэт падыходзіць да прыёмніка, даволі нервова выключае яго... Усё адбываецца на фоне цікання гадзінніка. Ён пачынае пісаць ліст. Настае раптоўная цішыня. Коласа не стала... Пісьменнікі, навукоўцы, музыканты лічылі за гонар наведаць адзінага на той час народнага паэта. Увогуле, Колас з ахвотаю знаёміўся і размаўляў з любым чалавекам, які прыходзіў да яго па параду. Каб узнавіць фрагмент сустрэч, якія ператвараліся ў свайго роду літаратурныя імпрэзы, пачуць вершы ў выкананні як самога Якуба Коласа, так і іншых паэтаў, была таксама агучана і гасцёўня Дома Коласа.

— На якую аўдыторыю робіце акцэнт у сваёй працы?

— Мы працуем у асноўным са школьнікамі, з дзіцячымі садкамі, яшчэ з дзяцінства пачынаем прывіваць любоў да літаратуры. Пры музеі створаны лялечны тэатр, у якім пастаноўкі ладзяць нашы ж супрацоўнікі (Колас напісаў шмат твораў для дзяцей). На сядзібе музея — «Паэтычны куток Песняра», дзе змешчаны скульптуры некаторых персанажаў Якуба Коласа — Лабановіча і Ядвісі, Сымона-музыкі. Для дзяцей — героі з дзіцячых твораў: сабачка Рудзька, Савось-распуснік, таксама рак-вусач.

— Ці можна сказаць, што Якуба Коласа ведаюць за межамі Беларусі?

— Мы імкнёмся пазнаёміць з творчасцю паэта як мага больш людзей. З гэтай мэтэй наладжаны стасункі з музеямі ў многіх краінах: Польшчы, Літве, Украіне, Расіі. Сёлета адзначаецца 90-годдзе выдання паэмы «Сымон-музыка». Да юбілейнай даты была створана выстаўка, якая была размешчана ў музеі-кватэры Блока (філіяле музея гісторыі Санкт-Пецярбурга). У літаратурным музеі Пушкіна ў Вільнюсе адкрылі выставу пад назвай «Дзядзька ў Вільні». Плануем у хуткім часе адкрыццё выстаўкі «Якуб Колас і рускія пісьменнікі» ў Калінінградскім абласным гісторыка-мастацкім музеі. Цесна супрацоўнічаем з Александраўскім літаратурна-мастацкім музеем Анастасіі і Марыны Цвятаевых, музеем-кватэрай Горкага ў Ніжнім Ноўгарадзе, музеем Дастаеўскага ў Санкт-Пецярбургу. У Польшчы, у горадзе Хэлмна, ёсць таварыства, якое носіць імя Якуба Коласа (там мы таксама адкрывалі выстаўку, прысвечаную нашаму класіку). Таварыства ніякім чынам не звязана з літаратурай, аднак яго ўдзельнікі, калі прачыталі «Новую зямлю» ў перакладзе на польскую мову, так упадабалі яе, што вырашылі надаць свайму аб'яднанню імя Якуба Коласа. Гэта яшчэ раз пацвярджае, што наш класік вядомы многім. Творы народнага паэта перакладзены больш як на 50 моў свету.

— Вы ўзначальваеце літаратурны музей ужо 27 гадоў. Ацаніце, што змянілася ў літаратурным працэсе ўвогуле за гэты час? Ці любіць моладзь літаратуру?

— Па сваіх унуках магу меркаваць, што тое, што ёсць у школьнай праграме, яны ведаюць. Аднак працаваць над тым, каб наблізіць беларускую літаратуру да маладога пакалення, вядома ж, трэба. Калі я шмат гадоў таму пачынала сваю працу ў музеі, сюды завітвалі, а таксама ездзілі разам з намі па раёнах Іван Шамякін, Ніл Гілевіч, Анатоль Вярцінскі, Сяргей Грахоўскі, кампазітар Анатоль Багатыроў і іншыя. У тыя часы на сустрэчы прыходзіла шмат людзей — яны ішлі, каб убачыць класікаў. А сёння гадуюцца новыя класікі. Асабіста я з захапленнем чытаю Людмілу Рублеўскую, Віктара Шніпа, Анатоля Бутэвіча, Генрыка Далідовіча. Сярод паэтаў магу адзначыць ураджэнцаў зямлі Коласа — Міколу Маляўку і Казіміра Камейшу, з маладых — Віктара Жыбуля, Валерыю Куставу. Часам у нашым музеі на «Кватэрнікі ў дзядзькі Якуба» збіраецца вельмі таленавітая і крэатыўная моладзь.

— У адным са сваіх інтэрв'ю вы казалі, што разумееце душу Коласа. Калі ж глядзець на гэта праз прызму сучаснасці, што ўплывае на фарміраванне асобы як пісьменніка? Чаму сярод іншых шляхоў ён выбраў менавіта гэты?

— Я не раз думала, што літаратурны працэс ідзе быццам хвалямі. У розныя перыяды гісторыі здараюцца свае вяршыні — з'яўляюцца выдатныя асобы. Напрыклад, Пушкін і Лермантаў, Дастаеўскі... У беларускай літаратуры пэўны час было зацішша, і раптам у адзін голас загучалі Купала і Колас. Я не думаю, што Коласа наўмысна накіроўвалі на літаратурны шлях. Хаця яго дзядзька Антось, калі ездзіў у Стоўбцы ці некуды на базар, прывозіў маленькаму Кастусю не нейкую цацку, а зборнічкі Пушкіна, Крылова. Колас гадаваўся ў лесе, быў сялянскім хлопцам (Купала, дарэчы, быў больш шляхетным), і на яго вялікі ўплыў аказала прырода. Аднак сотні і тысячы людзей жывуць на прыродзе і не робяцца пісьменнікамі — значыць, гэтая зорка была запалена звыш. Я ўпэўнена, што лёс прадвызначаны чалавеку яшчэ да яго нараджэння. Так было патрэбна, каб нарадзіліся Янка і Якуб: адзін летам, а другі — глухой восенню. Я дагэтуль здзіўляюся, як Коласа хапала на ўсё?.. Ён меў энцыклапедычныя веды ў многіх галінах: разбіраўся ў сельскай гаспадарцы (у «Весніку» Акадэміі навук нават быў апублікаваны яго дослед па вырошчванні ячменю і жыта на адным участку), навуцы, педагогіцы, выключна ведаў гісторыю, як сваю, так і сусветную. Быў выдатным псіхолагам і яшчэ да многага іншага меў здольнасці. Ён ад прыроды быў узнагароджаны розумам і памяццю. А яшчэ меў шчодрасць душы.

У кабінеце Коласа, звычайна закрытым для наведвання.

